ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

18 ЖНІЎНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 158 (28268)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



«Мы чужыя песні граем як сваe»




Настаўнік — на крок наперадзе часу



Археалагічны летнік для... школьнікаў

ЛІЧБА ДНЯ

**6,2 млрд руб.**

*склала ў краіне вытворчасць прадукцыі сельскай гаспадаркі ў бягучых цэнах у студзені-ліпені 2016 года ў гаспадарках усіх катэгорый (у сельскагаспадарчых арганізацыях, сялянскіх (фермерскіх) гаспадарках, гаспадарках насельніцтва). Яна павялічылася ў параўнанні з адпаведным перыядам 2015 года ў супастаўных цэнах на 4,2%. У сельскагаспадарчых арганізацыях выраблена прадукцыі на 5,8 млрд руб., што ў супастаўных цэнах на 4,7% больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года.*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 22° |
| Віцебск | + 21° |
| Гомель | + 23° |
| Гродна | + 20° |
| Магілёў | + 22° |
| Мінск | + 21° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.08.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9388 | ▼ |
| Еўра | 2,1833 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0303 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0772 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# НА ДНЯПРОЎСКІМ РУБЯЖЫ




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У Рагачове мясцовыя жыхары дапамагаюць будаўнікам добраўпарадкаваць і прыбраць свой горад да Дня беларускага пісьменства, які пройдзе тут у першыя верасноўскія выхадныя. Да агульнай справы далучыліся і супрацоўнікі мясцовага аддзялення Белпошты. Апрацоўшчыцы паштовай карэспандэнцыі аддзела падпіскі**

**Рагачоўскага РВПС Юліі КАРАЛЁВАЙ даверылі пачэсную місію — пафарбаваць сапраўдны танк часоў Вялікай Айчыннай. Гэта легендарная «трыццацьчацвёрка», якая ў складзе 120-й гвардзейскай дывізіі вызваляла горад ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і ўсталявана каля стэлы вызваліцелям у цэнтры горада над Дняпром.**

## Добрая справа

# СШЫТКІ І ПАРТФЕЛІ АД ПРАФСАЮЗАЎ

**Прафсаюзныя арганізацыі дапамагаюць сем'ям і сацыяльным установам падрыхтаваць дзяцей да навучальнага года.**

Для школьнікаў закупляюць канцылярскія тавары, падручнікі, адзенне і абутак. Неабходны прыналежнасці перадаюць вучням са шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў, дзецям-інвалідам, сіротам. Асаблівая ўвага — першакласнікам. Матэрыяльную дапамогу атрымліваюць таксама падшэфныя сацыяльныя прытулкі, школы-інтэрнаты, дамы сямейнага тыпу.

Напрыклад, у Камянецкім раёне, апроч традыцыйнай матэрыяльнай падтрымкі, прафсаюзы сумесна з мясцовай арганізацыяй БРСМ запусцілі дабрачынныя акцыі «У школу з Добрым Сэрцам» і «Збяры дзіця ў школу». Каб прыцягнуць да ўдзелу як мага больш людзей, валанцёры выходзяць да гандлёвых цэнтраў і базараў, дзе прапануюць усім наведвальнікам дапамагчы малазабяспечаным дзецям падрыхтавацца да навучальнага года. Кожны ахвотны можа купіць школьныя прылады і пакласці іх у спецыяльныя скрыні. Усе сабраныя тавары перададуць у сем'і і дзіцячыя сацыяльныя ўстановы раёна (прытулак, цэнтр карэкцыйнага навучання). Акцыі працягнуцца да сярэдзіны верасня.

Прафсаюз Рэчыцкай раённай жыллёва-камунальнай гаспадаркі ўжо шосты гад запар уручае партфелі са школьнымі прыладамі сваім супрацоўнікам, чые дзеці ідуць у першы клас. А актыў Белшыны перад навучальным годам аказвае матэрыяльную падтрымку шматдзетным і малазабяспечаным сем'ям.

Уздзенскія прафсаюзныя аб'яднанні набылі ранцы і канцтавары для школьнікаў з сем'яў, дзе выхоўваюцца пяць і больш дзяцей, і для першакласнікаў, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Падобная акцыя прайшла і ў Бярэзінскім раёне.

Гродзенскі абласны камітэт прафсаюза банкаўскіх работнікаў забяспечыў спартыўнымі касцюмамі і абуткам выхаванцаў Іўеўскага раённага сацыяльна-педагагічнага цэнтра.

Падобныя акцыі ФПБ праводзіць з 2002 года. Летась на падрыхтоўку школьнікаў да навучальнага года прафсаюзы накіравалі больш за 24,5 мільярда недэнамінаваных рублёў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

## Рэпарцёр атрымаў заданне...

# ЗРАБІЦЬ РАНІШНЮЮ РАЗМІНКУ

**Колькі ні гаворыцца пра карысць заняткаў фізкультурай і, у прыватнасці, ранішняй размінкі, наўрад ці можна сцвярджаць, што гэтая ідэалогія надта моцна ахапіла шырокія народныя масы. Хаця, канешне, прыхільнікаў нямала і, пэўна, становіцца ўсё больш. У гэтым можна пераканацца кожную раніцу на пляцоўках гродзенскіх мікрараёнаў і ў лесапарках.**



**Ранішняя размінка ў лесапарку Пышкі: і хадзьба, і трэнажоры пад адкрытым небам.**

Раніца. Да пачатку працоўнага дня яшчэ больш за дзве гадзіны. Чым заняцца? Паглядзець тэлевізар? Сесці за камп'ютар? А можа, прыслухацца да вядомых парад і аддаць перавагу фізкультуры? Для людзей, якія ўжо даўно прызвычаіліся да ранішняй размінкі, ніякай дылемы тут не існуе. А вось пачаткоўцам зрабіць выбар на яе карысць — прычым не на дзень, два, а ў рэгулярным рэжыме — даволі няпроста. Перашкаджае элементарная лянота. То настрою няма, то надвор'е не надта пасуе, то не хапае часу... Ніхто тут не дапаможа — толькі ўласная сіла волі.

СТАР. 3

# ДЭФІЦЫТУ ПЕДАГАГІЧНЫХ КАДРАЎ У СТАЛІЦЫ НЯМА

## Сцвярджаюць прадстаўнікі Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама

**1 верасня заняткі ў сталічных школах распачнуцца для 185,5 тысячы дзяцей. А напярэдадні (31 жніўня) ва ўсіх установах адукацыі пройдуць урачыстасці, прысвечаныя пачатку навучальнага года. Падчас урачыстых лінеек (пачатак а 10-й гадзіне) у бацькоў першакласнікаў будзе магчымасць азнаёміцца з бяспечнымі маршрутамі да школы.**

### Дашкольныя ўстановы — за кошт інвестараў

У новым навучальным годзе ў сталіцы будзе функцыянаваць 241 установа агульнай сярэдняй адукацыі, у тым ліку 51 гімназія і 2 ліцэі. Па стане на 15 жніўня ўжо ўсе ўстановы агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі Мінска атрымалі пашпарты гатоўнасці. Пра гэта паведаміла **начальнік аддзела тэхнагляду за капітальным і бягучым рамонтам устаноў адукацыі Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Галіна ХАРЫК.**

— Сёлета падрыхтоўка ўстаноў адукацыі завяршылася датэрмінова, мы спрацавалі на апераджэнне, — падкрэсліла спецыяліст. — Да таго ж былі рэалізаваны ўсе намечаныя мерапрыемствы па капітальным і бягучым рамонце. У Мінску сёлета ўжо ўведзены ў эксплуатацыю дзве дашкольныя ўстановы ў мікрараёнах Масюкоўшчына-5 і Міхалова-2 (кожная — на 230 месцаў). Два дзіцячыя садзікі ў мікраёне Каменная Горка будуць адкрыты ў самым хуткім часе (у канцы жніўня — пачатку верасня).

У адпаведнасці з інвестыцыйнай праграмай Мінска ў 2016 годзе ажыццяўляецца будаўніцтва агульнаадукацыйнай школы ў мікрараёне Масюкоўшчына-3 на 1020 месцаў. Яе ўвод запланаваны на люты 2017 года. Таксама ажыццяўляецца будаўніцтва сямі дашкольных устаноў з агульнай колькасцю месцаў 1440. Акрамя таго, за кошт сродкаў інвестара будуецца дзіцячы садзік у межах вуліц Брыля і Алібегава на 150 месцаў. Арыенціровачны тэрмін завяршэння будаўніча-мантажных работ — трэці квартал бягучага года. Гэты аб'ект будзе перададзены ў камунальную ўласнасць Мінска.

— У апошнія гады ў сталіцы актывізавалася ўзвядзенне дашкольных устаноў за кошт сродкаў інвестараў. Такім чынам, колькасць месцаў у дзіцячых дашкольных установах горада павялічыцца за кошт сродкаў бюджэту — на 920 і яшчэ на 150 — за кошт сродкаў інвестараў, — падкрэсліла Ганна Харык.

### Дзесяцікласнікі выбіраюць педагагічны профіль

Цікава, што колькасць школьнікаў у новым навучальным годзе павялічыцца ў сталіцы аж на 8 тысяч чалавек. Паводле папярэдняй інфармацыі, у горадзе плануецца адкрыць больш як 800 першых і больш як 420 дзясятых класаў, у тым ліку профільных — 229.

Як патлумачыла **начальнік аддзела дашкольнай, агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Марына ЮРКЕВІЧ**, колькасць профільных класаў прырастае ў сталіцы пераважна за кошт адкрыцця педагагічных класаў, якія карыстаюцца ў падлеткаў усё большай папулярнасцю. У профільных класах і пры арганізацыі ў школе мультыпрофільнага навучання дзесяцікласнікі могуць выбраць 2-3 прадметы, якія яны будуць вывучаць на павышаным узроўні. Для таго, каб быць залічанымі ў профільны клас, выпускнікі базавай школы праходзяць конкурсны адбор. Па профільных прадметах трэба было мець адзнаку ў атэстаце не менш як 7 балаў, а сярэдні бал атэстата — не ніжэйшы за 6. Тыя, хто не ўпісаўся ў гэтыя патрабаванні, вымушаны або выбраць базавы клас, або ўвогуле перайсці ў суседнюю школу, дзе захаваліся базавыя класы.

Для вучняў, якія жадаюць навучацца на роднай мове, у горадзе дзейнічаюць 5 гімназій, 5 агульнаадукацыйных школ і 2 дашкольныя ўстановы з беларускай мовай навучання.

Сёлета ва ўстановы адукацыі сталіцы накіраваны 581 малады спецыяліст. І, як запэўнівае Марына Юркевіч, вострага дэфіцыту педагагічных кадраў у горадзе няма. У школах хапае філолагаў, настаўнікаў матэматыкі і прыродазнаўчых дысцыплін. Цякучасці кадраў у сістэме адукацыі таксама не назіраецца...

— Захоўваецца толькі патрэба ў настаўніках пачатковых класаў і выхавальніках дашкольных устаноў, аднак усе вакансіі, а іх няшмат, будуць да 1 верасня закрытыя. На іх плануецца прыцягнуць педагогаў-пенсіянераў, студэнтаў пятых курсаў педагагічных спецыяльнасцяў і пераразмеркаваць нагрузку паміж педагогамі гэтых устаноў, — дадала Марына Юркевіч.

### Самыя прывабныя прафесіі

Дарэчы, для таго, каб закрыць патрэбу сталіцы ў настаўніках пачатковых класаў і выхавальніках дашкольных устаноў, сёлета ў горадзе быў адкрыты Мінскі гарадскі педагагічны каледж, які будзе рыхтаваць педагогаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй. У першы набор прахадны бал на спецыяльнасць «пачатковая адукацыя» склаў 7,75, а на спецыяльнасць «дашкольная адукацыя» — 7,12 (прыём абітурыентаў ажыццяўляўся на конкурсе пасведчанняў аб заканчэнні базавай школы). Прычым сярод залічаных на навучанне трапляліся і тыя, чый сярэдні бал пасведчання быў блізкі да 10. Ужо ў першыя дні прыёму дакументаў планавыя лічбы прыёму былі практычна дасягнуты. Так, на спецыяльнасць «пачатковая адукацыя» было пададзена 83 заявы: пры плане прыёму 50 чалавек конкурс склаў 1,66. На спецыяльнасць «дашкольная адукацыя» пададзена 64 заявы: пры плане прыёму 25 чалавек конкурс — 2,56 чалавека на месца. А на завочную форму навучання на 20 бюджэтных месцаў прэтэндавалі 70 чалавек. Тэрмін навучання будучых педагогаў на аснове базавай адукацыі складае 3 гады 10 месяцаў, таму першых выпускнікоў каледжа сталічныя школы і дзіцячыя садзікі прымуць у 2020 годзе.

Прыёмная кампанія ва ўстановах сярэдняй спецыяльнай адукацыі ўжо завяршылася, але да 20 жніўня ў сталіцы працягваецца прыём дакументаў ва ўстановы прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Яны ўжо ўкамплектаваліся больш як на 90 працэнтаў. Рэйтынг папулярнасці ў моладзі традыцыйна ўзначальваюць прафесіі цырульніка, кухара, слесара па рамонце аўтамабіляў, памочніка машыніста электравоза...

**Для вучняў, якія жадаюць навучацца на роднай мове, у горадзе дзейнічаюць пяць гімназій, 5 агульнаадукацыйных школ і 2 дашкольныя ўстановы з беларускай мовай навучання.**

— На спецыяльнасць «кухар» на базе 9 класаў сёлета назіраўся сапраўдны аншлаг: сярэдні прахадны бал не апускаўся ніжэй за 6,5 бала, — паведаміла **начальнік сектара прафесійна-тэхнічнай адукацыі Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Алена ЧАРНЫХ**. — Праявіла моладзь цікавасць і да новай спецыяльнасці ў Каледжы будаўніцтва і камунальнай гаспадаркі «рабочы па комплексным абслугоўванні будынкаў і збудаванняў», дзе будуць рыхтаваць хаус-майстроў. Менш запатрабаванымі ў абітурыентаў аказаліся спецыяльнасці машынабудаўнічага профілю (ліцэі №3 і №9) Таму, магчыма, тут будзе працягнуты прыём дакументаў да 1 верасня. Не выключана, што да іх могуць далучыцца і асобныя навучальныя ўстановы будаўнічага профілю.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

■ Ёсць пытанне

## Хто мае права на бясплатныя падручнікі?

**«Выхоўваю траіх малалетніх дзяцей і хацела б сама навучаць іх дома. Чула, што такая магчымасць ёсць. У мяне вышэйшая педагагічная адукацыя, скончыла аспірантуру па спецыяльнасці «Агульная педагогіка». Дзеці пойдуць у 2-гі, 4-ты і 7-мы клас. Ці могуць мне дазволіць займацца іх навучаннем і прадаставіць бясплатныя падручнікі?»**

**Наталля Малочка**, *г. Мінск.*

У Міністэрстве адукацыі тлумачаць, што навучанне дома прадугледжана для дзяцей, якія па стане здароўя часова або пастаянна не могуць наведваць школу. Пералік медыцынскіх паказанняў для гэтага вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя. Адукацыйны працэс у такім выпадку арганізуе школа па месцы жыхарства ці тая, дзе дзіця навучалася дагэтуль.

Акрамя таго, у адпаведнасці з пунктам 69 Палажэння аб установе агульнай сярэдняй адукацыі (пастанова Міністэрства адукацыі ад 20 снежня 2011 года №283) навучальны працэс пры рэалізацыі школьных праграм можа ажыццяўляцца па індывідуальным плане для адораных і таленавітых вучняў, а таксама для дзяцей, якія з уважлівых прычын пастаянна або часова на працягу навучальнага года не могуць наведваць заняткі і праходзіць ва ўстаноўленыя тэрміны атэстацыю.

Для таго каб арганізаваць адукацыйны працэс дома па індывідуальным плане, вучню ці яго законнаму прадстаўніку неабходна падаць заяву на імя кіраўніка ўстановы адукацыі па месцы жыхарства. Рашэнне прымаецца на працягу 10 каляндарных дзён з дня падачы заявы.

Рашэнне аб тэрмінах і формах правядзення атэстацыі вучня прымае школа і паведамляе пра гэта непаўналетняму або яго законнаму прадстаўніку ў пісьмовай форме на працягу наступных пяці дзён.

Што да бясплатнага карыстання падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі, то на яго, згодна з артыкулам 39 Кодэкса аб адукацыі, маюць права вучні з сем'яў, якія атрымліваюць дзяржаўную дапамогу на дзяцей, старэйшых за тры гады. **Намеснік міністра адукацыі Раіса СІДАРЭНКА** адказвае, што да гэтай катэгорыі адносяцца, напрыклад, сем'і, дзе выхоўваецца дзіця-інвалід ва ўзросце да 18 гадоў, непаўналетні, інфіцыраваны ВІЧ. Бясплатнымі падручнікамі забяспечваюць таксама ў выпадках, калі бацька (айчым) або ўсынавіцель з'яўляюцца ваеннаслужачымі, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу; абодва бацькі ў поўнай сям'і ці адзін у няпоўнай — інваліды 1-й ці 2-й групы; адзін з бацькоў у поўнай сям'і мае 1-ю групу інваліднасці, а другі ажыццяўляе догляд за ім і атрымлівае дапамогу.

Для вучняў са шматдзетных сем'яў плата за карыстанне падручнікамі і дапаможнікамі зніжаецца на 50 працэнтаў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Арыфметыка ведаў

## Самыя дарагія падручнікі — у шасцікласнікаў

**Міністэрствам адукацыі зацверджаны памер платы за карыстанне школьнымі падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі ў 2016/2017 навучальным годзе.**

Так, за вучэбны дапаможнік «Падарожжа ў свет музыкі» бацькам дашкольнікаў трэба будзе заплаціць Br0,55 і Br0,52 — за рабочы сшытак да дапаможніка. За дапаможнік «Матэматычны калейдаскоп» — Br0,56 плюс Br0,59 — за рабочы сшытак. Дапаможнік «Свята вакол мяне» — Br0,55 і Br0,5 — за рабочы сшытак.

Кошт падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для першакласнікаў складае Br5,61, для 2-га класа — Br7,7, для 3-га класа — Br5,5, 4-га класа — Br6,69, 5-га класа — Br10,76, 6-га класа — Br14,04, 7-га класа — Br8,12, 8-га класа — Br8,7, 9-га класа — Br8,01, 10-га класа — Br11,46 і для 11-га класа — Br11,98.

Як і ў папярэднія гады, бацькі будуць аплачваць толькі 50% ад кошту падручнікаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## КОЖНАМУ ПА СВАЙМУ СШЫТКУ

**Прадпрыемствы канцэрна «Беллеспапапрам» напярэдадні сёлетняга школьнага сезона паставілі ў гандаль 6,5 мільёна сшыткаў.**

«Агульныя сшыткі з рознай колькасцю старонак ёсць у 50 варыянтах афармлення — для малодшага, старэйшага школьнага ўзросту і студэнтаў. Яшчэ больш асартымент у альбомаў для малявання і блакнотаў», — паведаміла **прэс-сакратар канцэрна Ружэна НАВІЦКАЯ**. Апроч школьных і агульных сшыткаў, у крамы дастаўлена і іншая прадукцыя: сшыткі для малявання, альбомы і блокі для чарчэння, блокі для малявання, сшыткі для нот, папера для запісаў. За студзень—ліпень прадпрыемствы канцэрна паставілі на ўнутраны рынак 17,7 мільёна сшыткаў, што на 10 працэнтаў больш, чым было пастаўлена ў гандаль за той жа перыяд летась. Такім чынам рэалізуецца праграма імпартазамяшчэння, што прадугледжвае пашырэнне асартыменту прадукцыі, якая выпускаецца, а таксама паляпшэнне яе якасці, у тым ліку і знешняга выгляду.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## ВЫСЛУХАЦЬ, ПАРАІЦЬ І ДАПАМАГЧЫ

Мінгарвыканкам і аблвыканкамы правядуць 20 жніўня чарговыя прамыя лініі. З 9.00 да 12.00 па тэлефонных званкі будуць адказваць:

**Брэсцкі аблвыканкам**
намеснік старшыні СЯРКОЎ Міхаіл Мікалаевіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
намеснік старшыні СІВЕЦ Уладзімір Мікалаевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ПАЧЫНОК Алег Міхайлавіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні ЖУК Іван Алёйзавіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
старшыня ДАМАНЕЎСКІ Уладзімір Віктаравіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
старшыня Савета дэпутатаў ЛІПНІЦКІ Іван Эдуардавіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
намеснік старшыні ДАМАРАЦКІ Андрэй Уладзіміравіч (80172224444).

■ Парламенцкі дзённік

## Сенатары абмяркуюць развіццё краіны

**У сераду, 24 жніўня, у Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу адбудзецца пашыранае пасяджэнне Прэзідыума верхняй палаты парламента на чале з яе старшынёй Міхаілам МЯСНІКОВІЧАМ.**

Парламентарыі абмяркуюць, якую ролю Савет Рэспублікі можа адыграць у рэалізацыі асноўных палажэнняў Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016—2020 гады, што была ўхвалена на пятым Усебеларускім народным сходзе. Асаблівую ўвагу сенатары нададуць рабоце ў такіх прыярытэтных кірунках як інвестыцыі, занятасць насельніцтва, экспарт, інфарматызацыя і моладзь.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

### ПРАМАЯ ЛІНІЯ

### Сацыяльныя гарантыі дзяржавы

Якія віды сацыяльнай дапамогі гарантуюцца дзяржавай і хто мае права на іх атрыманне? Куды звяртацца ў выпадку цяжкай жыццёвай сітуацыі? На якую падтрымку могуць разлічваць сем'і з дзецьмі? На якія формы сацыяльнага абслугоўвання варта звярнуць увагу пенсіянерам? Гэтыя і іншыя пытанні вы зможаце задаць на «прамой лініі» госцю нашай рэдакцыі — **галоўнаму спецыялісту аддзела адраснай сацыяльнай дапамогі і сацыяльнага абслугоўвання ўпраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Тацццяне Мікалаеўне ТАЛАЛАЕВАЙ.**

Тэлефануйце **23 жніўня з 11 да 12 гадзін па тэлефоне 8 (017) 287-18-71.**

Папярэднія пытанні можаце задаць 23 жніўня па тым жа тэлефоне з 9 да 11 гадзін або даслаць (з пазнакай «Прамая лінія») на электронны адрас info@zviazda.by або па пошце: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

## ЭЛІТНЫ БАНК

**Унікальны навуковы аб'ект — Рэспубліканскі банк ДНК чалавека, жывёл, раслін і мікраарганізмаў абвешчаны нацыянальным здабыткам. Гэта прадугледжана адпаведнай пастановай Савета Міністраў.**

Адказнасць за яго захаванне і забеспячэнне належнага функцыянавання ўскладзена на Нацыянальную акадэмію навук.

Па стане на 1 чэрвеня рэспубліканскі банк налічваў 9 608 узораў ДНК чалавек, жывёл, раслін і мікраарганізмаў.

Банк ДНК раслін і жывёл можа спатрэбіцца для аховы рэдкіх відаў і захавання біялагічнай разнастайнасці. Банк ДНК чалавека дазваляе спецыялістам вывучаць фундаментальныя праблемы генетыкі чалавека, улічваць індывідуальныя генетычныя асаблівасці спартсменаў для дасягнення імі высокіх спартыўных вынікаў, вывучаць індывідуальную адчувальнасць да лекавых прэпаратаў, а таксама садзейнічаць вырашэнню пытанняў у галіне крыміналістыкі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

## ХВАРЭЦЬ ЗА СВАІХ

Учора на Алімпіядзе выступленні пачалі Марына Арзамасава і Іван Ціхан, працягнулі змагацца за ўзнагароды Аліна Талай і беларускія прадстаўнікі ў алімпійскім турніры па веславанні на байдарках і каноэ. Іх вынікі вы ўжо, напэўна, ведаеце.

Сёння праграму гульняў працягнуць баскетбольны, гандбольны і валейбольны турніры, акрамя гэтага, узнагароды будуць разыграны ў некаторых відах лёгкай атлетыкі, веславанні, водным пола, вольнай барацьбе, боксе і сінхронным плаванні.

## КОЛЬКІ ПЛАЦЯЦЬ?

### Якія прэміяльныя чакаюць алімпійскіх чэмпіёнаў розных краін

**На даўняй традыцыі спартсмены, якія заваёўваюць узнагароды на галоўных стартах чатырохгоддзя, у сябе на радзіме не застаюцца абдзеленымі не толькі ўвагай, але і грашыма. Яшчэ ў Старажытнай Грэцыі пераможцы Алімпіяд карысталіся пэўнымі прывілеямі ў грамадстве: чэмпіёнам выплачвалі 500 драхмаў, ім высякалі мармуровы помнік на поўны рост, а таксама да канца дзён бясплатна кармілі ў грамадскіх сталовых і пускалі на першыя рады тэатраў. Цяпер, зразумела, усё па-іншаму.**



Сярод краін разгарнулася цэлая гонка: хто дасць сваім спартсменам найвышэйшае ўзнагароджанне. Сумы розныя — напэўна, яны, перш за ўсё, залежаць ад фінансавых магчымасцяў канкрэтнай краіны. У той жа час некаторыя эканамічна развітыя дзяржавы не плацяць сваім спартсменам наогул.

**Беларусь**

Мы знаходзімся ў першай дзясятцы краін-удзельніц Рыа-2016 па суме ўзнагароджання за залатыя медалі. Кожны спартсмен, які зойме 1-е месца, атрымае 150 тысяч долараў ад дзяржавы. За другое месца — 75 тысяч долараў, а за 3-е — 50 тысяч. Таксама ў выпадку заваявання алімпійскіх узнагарод атлеты могуць дадаткова разлічваць на алімпійскую стыпендыю, якая выплачваецца на працягу 4-х гадоў.

**Сінгапур**

Гэтая высокаразвітая краіна сёлета самая шчодрая ў плане алімпійскіх прэмій. Пераможцы атрымаюць па 745 тысяч долараў. За перамогу на Алімпіядзе 2012 года ў Лондане Сінгапур абяцаў выплаціць кожнаму свайму чэмпіёну па 800 тысяч долараў, але адзначым, што ў сваёй гісторыі спартсмены гэтай краіны яшчэ ні разу не выйгравалі алімпійскае «золата».

**Азербайджан**

Азербайджан знаходзіцца на другім месцы дадзенага рэйтынгу на сёлетніх Алімпійскіх гульнях. Прадстаўнікі краіны, якія паднімуцца на першую прыступку п'едэстала, атрымаюць 510 тысяч долараў.

**ЗША**

У Злучаных Штатах з 1984 года не мяняюць суму прэміяльных за алімпійскія медалі для сваіх спартсменаў і выплачваюць залатым медалістам усяго 25 тысяч долараў. Уяўляеце, колькі зарабіў Майкл Фелпс? Ён ужо 22-разовы алімпійскі чэмпіён.

**Кітай**

Кітайская каманда разам з амерыканцамі сёння знаходзіцца ў фаварытах у спісе агульнакамандага заліку. Спартсмены Паднябеснай атрымаюць ад свайго алімпійскага камітэта за залаты медаль па 50 тысяч долараў, 25 тысяч — за «серабро» і 15 тысяч — за «бронзу». Дарэчы, на мінулых алімпіядах Кітай за сярэбраныя і бронзавыя ўзнагароды зусім не выплачваў атлетам прэміі, але ім гарантавалася пажыццёвае працаўладкаванне ў кітайскіх спартыўных ведамствах або міліцэйскіх правінцыях.

**Украіна**

З краін-суседак больш за ўсіх за алімпійскае «золата» заплаціць Украіна. Прызавыя ганарары там будуць наступныя: уладальнік «золата» атрымае ад дзяржавы 125 тысяч долараў, 80 тысяч — за «серабро» і 55 тысяч — за бронзавую ўзнагароду.

**Расія**

У студзені 2015 года прэм'ер-міністр Расіі Дзмітрый Мядзведзеў падпісаў распараджэнне, якое вызначала памер прызавых для расійскіх спартсменаў за дасягненні на Алімпіядзе-2016 у Рыа. Залатыя медалісты атрымаюць па 60 тысяч долараў, сярэбраныя — 37 тысяч, бронзавыя — 25 тысяч.

Адзначым, што на папярэдніх летніх Алімпійскіх гульнях у Лондане расійская каманда заваявала 82 узнагароды (24 залатыя, 25 сярэбраных, 33 бронзавыя).

**Польшча**

За «золата» палякі атрымаюць 38 тысяч долараў, 25 тысяч — «серабро», 16 тысяч — «бронза».

Акрамя таго, спартсмены могуць разлічваць на спонсарскія падарункі ў выглядзе бюджэтных аўтамабіляў. Але таксама варта адзначыць і тое, што ў шматлікіх выпадках у Польшчы падрыхтоўка да Гульняў вядзецца спартсменамі практычна за ўласны кошт.

**...і іншыя**

Вялікабрытанія, Нарвегія, Швецыя, Харватыя наогул нічога не плацяць сваім алімпійскім чэмпіёнам і прызёрам Гульняў. Тлумачэнне простае: бюджэт краіны ідзе на развіццё дзіцячага і маладзёжнага спорту, а таксама на папулярызацыю здаровага ладу жыцця сярод грамадзян.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

# ЗРАБІЦЬ РАНІШНЮЮ РАЗМІНКУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**• У ТЭМУ**

*Спецыялісты сцвярджаюць, што карысць ад фізічных практыкаванняў, якую арганізм атрымлівае падчас ранішняй фізкультуры, вялізная. Яна дапамагае хутчэй «перавесці» арганізм у рабочы рэжым пасля сну, павышае тонус. Паляпшаецца стан сэрца і нерваў, прачышчаюцца энергетычныя каналы, умацоўваецца мускулатура, адступае бяссонніца, нармалізуецца маса цела. Размінка прынясе максімальную карысць, калі з часам практыкаванні будуць удасканальвацца і ўскладняцца. Аднак пры гэтым трэба пазбягаць празмернай нагрузкі на арганізм. Калі ёсць пачуццё стомленасці, то нагрузку трэба знізіць.*

Пачынаю размінку прама ў кватэры. Хвілін пяць займаюся фізічнымі практыкаваннямі, а затым выходжу на вуліцу. Шукаць зручную пляцоўку для хадзьбы ці прабежкі не трэба. Нашай шматпавярхоўцы пашанцавала: побач ёсць каток (зімой, калі дазваляе надвор'е, сюды прыходзяць з канькамі і клюшкамі), а вакол яго — асфальтаваная дарожка. Па маім прыблізным падліку, адзін круг па ёй складае каля 300 метраў, і, такім чынам, кожны можа вызначыць аптымальную для сябе дыстанцыю для ранішняй размінкі. Пры гэтым нішто не перашкаджае спалучаць хадзьбу ці бег з «паўзамі» для заняткаў тымі ці іншымі практыкаваннямі.

Але, можа, такія ўмовы ёсць толькі ў нашым і суседніх дамах, а ў іншых заняцца ранішняй размінкай проста немагчыма? Спецыяльна прайшоўся па нашым мікраёне і ўбачыў, што практычна ўсюды побач з жылымі дамамі альбо блізка ад іх адпаведнае месца ёсць. Прычым раніцай, калі аўтамабільны рух яшчэ не пачаўся, транспарт праблем для аматараў размінкі не ствярае.

Зрэшты, займацца ранішняй размінкай зусім неабавязкова толькі каля дома. Гэта зручна, але ёсць і больш казырны варыянт з пункту гледжання экалогіі, чыстага паветра — лесапаркі Пышкі і Румлёва, якія прырода падарыла жыхарам горада над Нёманам. Яны знаходзяцца ў межах горада, літаральна побач з жылымі мікраёнамі. Гродна — не мегаполіс, і дабрацца на гэтую «тэрыторыю здароўя» шмат часу не зойме. Хтосьці прыходзіць пешшу, а я, напрыклад, пад'язджаю да лесапарка Пышкі на аўтамабілі, пакідаю яго на стаянцы і накіроўваюся на маршруце з сімвалічнай назвай «Сцяжына здароўя». Як правіла, праходжу 3,5-4 кіламетры, а таксама карыстаюся бясплатнымі паслугамі трэнажораў для заняткаў варкаўтам — фізкультурай пад адкрытым небам. Гэтую пляцоўку ў Пышках абсталявалі зусім нядаўна, але яна ўжо, як бачна, прыцягвае вялікую колькасць аматараў ранішняй размінкі.

Калі ж пагодныя ўмовы неспрыяльныя, моцны дождж, то лагічна зрабіць размінку прама ў кватэры. Адпаведныя комплексы практыкаванняў у інтэрнэце так і «просяцца», каб вы звярнулі на іх увагу. Можна нават стаць каля камп'ютара і выконваць тое, што прапануе відэасюжэт.

**• У ТЭМУ**

*Ва Упраўленні спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама зараз ствараюць інтэрактыўную карту аб'ектаў вобласці для заняткаў фізкультурай і спортам — з пералікам паслуг і рэжымам работы. Акрамя стадыёнаў, спартыўных, трэнажорных і фітнес-залаў, будуць пазначаны адпаведныя пункты пракату, крамы, базы адпачынку, а таксама аб'екты ўстаноў адукацыі, якімі могуць скарыстацца жыхары мікраёнаў. Гэтая карта будзе размешчана на сайце Упраўлення спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама са спасылкамі на яе на іншых інтэрнэт-рэсурсах рэгіёну.*

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## ПАЧЫНАЕЦЦА ПАЛЯВАННЕ НА КАПЫТНЫХ

**З 20 жніўня ў краіне распачынаецца сезон палявання на капытных жывёл. У гэтай сувязі ўсе падраздзяленні Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь будуць працаваць ва ўзмоцненым рэжыме.**

З названай даты можна будзе здабываць ласёў, аленяў (высакародных і плямістых), ланяў. Доўжыцца сезон палявання на капытных па 30 верасня. У гэты час дазволена здабыча дарослых самцоў і селекцыйных жывёл любога полу і ўзросту цягам сутак зброевым спосабам з засады і падыходу. Пры гэтым можна выкарыстоўваць наразную паляўнічую зброю з дульнай энергіяй звыш 3000 джоўляў, гладкаствольную паляўнічую зброю і кулявыя патроны, а таксама паляўнічыя лукі і арбалеты пэўных параметраў.

У наступныя выходныя дні ўсе падраздзяленні Дзяржінспекцыі будуць задзейнічаны на кантрольных мерапрыемствах, скіраваных на прадухіленне незаконных паляванняў, якія пройдуць ва ўсіх раёнах і паляўнічых угоддзях краіны.

## У ЛЬВОЎ — НА САМАЛЁЦЕ

**Авіякампанія «Белавія» адкрыла рэгулярныя рэйсы паміж Львовам і Мінскам.**

На новым маршруце беларускі перавозчык плануе выкарыстоўваць рэгіянальныя самалёты Embraer 175. Рэйсы будуць выконвацца чатыры разы на тыдзень — па аўторках, серадах, чацвяргах і суботах. Як паведамілі ў авіякампаніі, вылет з Мінска — у 13.10, вяртанне са Львова назад — у 15.20. Кошт білетаў у абодва бакі складае ў эквіваленце 120 еўра. Як лічыць беларускі перавозчык, новы рэйс Львоў—Мінск дазволіць перасаджвацца ў беларускай сталіцы на рэйсы ў Маскву ў рамках адзінага білета з чаканнем адну гадзіну на ўласныя рэйсы, а таксама з больш працяглым чаканнем на рэйсы «Ютэйр».

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

## А ЯМУ ЎСЁ ТРЫН-ТРАВА

**У Бабруйску 20-гадовы кіроўца збіў інспектара ДАІ.**

Гэта адбылося на рагу вуліц Кастрычніцкая і Шмідта, калі малады чалавек спрабаваў перастроіцца ў іншую паласу руху. Інспектар, які апынуўся на шляху неўтаймаванай машыны, атрымаў закрытую чэрапна-мазгавую траўму і быў шпіталізаваны ў нейрахірургічнае аддзяленне мясцовай бальніцы. Зараз яго жыццю нічога не пагражае.

А вось кіроўцу не пазайздросціш. Месяц таму ён за паездкі ў нецвярозым стане быў пазбаўлены на 3 гады права садзіцца за руль і павінен быў выплаціць штраф звыш 13 мільёнаў старымі грашыма. Але выснову ніякіх не зрабіў. Па факце ДТЗ праводзіцца праверка. У кіроўцы ўзятыя біялагічныя ўзоры для вызначэння фізічнага стану, паведамілі ў аддзяленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Магілёўскага аблвыканкама.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Выбары-2016: меркаванне

# «ВЕЛЬМІ СПАДАБАЛАСЯ ПАЗІЦЫЯ КАМІСІІ: НЕ БЫЛО АБЫЯКАВАСЦІ»

**Рэгістрацыя кандыдатаў у дэпутаты скончылася. Цяпер чарга за агітацыйнымі кампаніямі. Як прайшоў гэты этап на месцах? Пра гэта расказала назіральнік ад РГА «Белая Русь» Тацяна БЕРАСЦЕВІЧ, якая сачыла за выбарамі на сталічнай Дамброўскай акрузе № 103.**

— Было зарэгістравана шэсць кандыдатаў, усе атрымалі пасведчанне. Пасяджэнне прайшло спакойна, дэмакратычна, даступна. На ім інфармавалі аб праверцы подпісаў і аб дакладнасці звестак па дэкларацыям. Былі нязначныя недакладнасці па запаўненні дакументаў, але ў працэнтных адносінах — усё ў рамках закона. Ніякіх парушэнняў не было. Кандыдаты ўрачыста атрымалі пасведчанні. Бачна, што людзі да гэтай падзеі рыхтаваліся. Камісія ім растлумачыла правілы паводзінаў, звярнула ўвагу на палітычную культуру.

Я не першы год назіраю, таму ёсць з чым параўноўваць. Мне вельмі спадабалася пазіцыя камісіі: не было абыякавасці. Не толькі сакратар і старшыня, але і члены камісіі задавалі пытанні, цікавіліся.

Тацяна Лявонцеўна — назіральнік з вялікім стажам. Тым, хто прыйдзе ўпершыню сачыць за выбарамі, яна парэкамендавала, у першую чаргу, самастойна вывучыць дакументы. Заканадаўчая база — важная крыніца ведаў для назіральнікаў. Другі момант — культура паводзін. Гэта абавязковае патрабаванне да ўсіх удзельнікаў электаральнага працэсу. Аб гэтым нагадала і **намеснік старшыні выбарчай камісіі па Дамброўскай акрузе Ірына ДРОЗД**:

— Усе непаразуменні мы ў веснай форме вырашалі, тлумачылі правілы, у тым ліку паводзін, пісьмовых заўваг не было. Першапачаткова ў нас рэгістраваліся ініцыятыўныя групы, але ў выніку толькі адзін кандыдат прыйшоў на рэгістрацыю, сабраўшы больш за 4000 подпісаў, а астатнія былі вылучаны ад партый. Гэта прадстаўнікі розных палітычных кірункаў: Камуністычнай партыі Беларусі, Аб'яднанай грамадзянскай партыі, БНФ, Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці, Ліберальна-дэмакратычнай партыі. Гендарны прынцып у нас вытрыманы: тры жанчыны і тры мужчыны. Кандыдаты — людзі розных прафесій: індывідуальны прадпрымальнік, майстар ЖРЭА, эканаміст, бухгалтар. Усе з вышэйшай адукацыяй. Некаторыя з іх ужо прымалі ўдзел у выбарах, але ёсць і новыя твары.

У нас самая вялікая тэрытарыяльная акруга ў Фрунзенскім раёне: 39 участковых камісій, больш за 63 тысячы выбаршчыкаў. Ужо акрэдытаваліся 17 назіральнікаў: ад «Белай Русі», СНД, АБСЕ, Беларускага фонду міру, Беларускага саюза жанчын, Камуністычнай партыі Беларусі, Беларускай асацыяцыі шматдзетных бацькоў і іншыя. Пакуль што толькі адзін з назіральнікаў прысутнічаў на ўсіх пасяджэннях камісіі, большасць прыходзіць перыядычна. Некаторыя толькі акрэдытаваліся, але пакуль не наведалі пасяджэнняў. Але чым бліжэй да даты выбараў, тым работа будзе больш напружанай і цікавай.

**Надзея АНІСОВІЧ.** *anisovich@zviazda.by*

■ Выбары-2016: праграма кандыдата

## ПЕРАДВЫБАРНАЯ ПРАГРАМА АЛЕГА ТРУСАВА

# ЗА ЗМЕНЫ РАЗАМ

Паважаныя выбаршчыкі 96-й акругі Кастрычніцкага раёна горада Мінска!

11 верасня гэтага года адбудуцца чарговыя парламенцкія выбары. У сувязі са складанай сітуацыяй у нашай краіне, якая праяўляецца ў доўгатэрміновым эканамічным крызісе (зніжаюцца заробкі і пенсіі, растуць кошты на тавары першай неабходнасці, скарачаецца колькасць працоўных месцаў, людзі атрымліваюць жабрацкую пенсію пры адначасовым павелічэнні пенсійнага ўзросту), я вырашыў прыняць удзел у гэтых парламенцкіх выбарах, бо маю досвед працы ў беларускім парламенце ў самы адказны для нашай Бацькаўшчыны час (1990-1996 гг.). Прапаную вам абмеркаваць і — падтрымаць наступную праграму.

**I. У Кастрычніцкім раёне** горада Мінска я прапаную:

1. Палепшыць экалагічны стан Кастрычніцкага раёна, звязаны з забруджваннем паветра і глебы пад прыдарожнымі прысадамі, спыніўшы высечку ўсіх зялёных насаджэнняў у раёне і тэрмінова замяніўшы тыя, што загінулі. У першую чаргу гэта датычыцца вуліц Каржанеўскага, Чкалава, Казінца, Кіжаватава, Варанянскага, Магілеўскай, Сярова, Брэсцкай, Аэрадромнай, Брылеўскай, а таксама двух чыгуначных трас, плошчаў Прывакзальнай і Казінца. Паводле назіранняў экалагаў жыццёвы стан прыдарожных прысадаў з клёна, каштана і ліпы па вуліцы Каржанеўскага — адзін з самых дрэнных у Мінску.

2. Спыніць так званае ўшчыльненне і не будаваць без грамадскага абмеркавання і згоды жыхароў раёна новыя прадпрыемствы і будынкі.

3. Адкрыць у раёне некалькі новых дзіцячых садкоў, у тым ліку і беларускамоўны садок.

4. На базе адной з найлепшых школ раёна адкрыць новую гімназію з беларускай мовай навучання.



**II. У горадзе Мінску** зрабіць ільготны праезд у грамадскім транспарце за кошт гарадскога бюджэту для студэнтаў і пенсіянераў.

**III. У Беларусі:**

1. Адмяніць абавязковае размеркаванне студэнтаў. Размеркаванне з неабходным сацыяльным пакетам павінны атрымаць з іх згоды найлепшыя выпускнікі ВНУ.

2. Зрабіць рэформу заробкаў, пры гэтым прывязаць заробкі і пенсіі чыноўнікаў да сярэдніх па краіне. Настаўнік, медык, работнік культуры, сацыяльны работнік, выкладчык ВНУ павінны мець заробак, адпаведны заробку міліцыянта, вайскоўца, мытніка і іншых дзяржслужбоўцаў. Толькі тады наша краіна дасягне дабрабыту і міжнароднага аўтарытэту.

3. Правесці пенсійную рэформу, пры якой выхад на пенсію па ўзросце для ўсіх катэгорый службоўцаў і розных спецыялістаў павінен быць аднолькавы, незалежна ад займаемай пасады. Выключэнне можа быць зроблена толькі для тых, хто заняты ў шкодный вытворчасці. Памер пенсіі залежыць толькі ад выслугі работніка і атрымліваемага сярэдняга заробку. Усе прывілеі для чыноўнікаў, дэпутатаў і пэўных катэгорый службоўцаў адмяняюцца. Пенсія настаўніка, трактарыста, даяркі, дацэнта і прафесара ВНУ павінна адпавядаць пенсіі беларускага вайскоўца, міліцыянта, дырэктара завода альбо мясцовага бюракрата.

4. У кожным раённым цэнтры Беларусі ствараецца як мінімум адна беларускамоўная гімназія, а ў Мінску адкрываецца класічны ўніверсітэт з беларускай мовай навучання.

5. Стварыць у Беларусі інстытут Упаўнаважанага па правах чалавека, у тым ліку і Упаўнаважанага па правах дзіцяці, надаўшы яму назву «Народны праваабаронца па правах дзіцяці».

6. Беларускі парламент патрабуе істотных зменаў:

— адмена верхняй палаты (Савета Рэспублікі);

— законы, прынятыя парламентам, маюць сілу больш значную, чым дэкрэты Прэзідэнта і пастановы Савета Міністраў. Мenaвіта яны павінны выконвацца бездакорна;

— заробкі і пенсіі дэпутатаў парламента прывязваюцца і залежаць ад сярэдняга заробку і пенсій па краіне;

— усе законы прымаюцца на дзяржаўнай беларускай мове з перакладам на рускую і іншыя мовы пры неабходнасці;

— на працягу бліжэйшага тэрміну прымаецца закон аб дзяржаўнай падтрымцы беларускай мовы;

— выдаткі на культуру павінны складаць не менш за 2 працэнты ад гадавога бюджэту.

■ Унікальны вопыт

### На постсавецкай прасторы наша краіна адзіная захавала тэхналогію нарыхтоўкі жывіцы

# НЯБАЧНАЕ БАГАЦЦЕ АЙЧЫННАГА ЛЕСУ

**Больш за 40% нашай краіны пакрыта лясным масівам, што робіць драўніну важным экспартным рэсурсам, які прыцягвае валюту ў Беларусь. Аднак гэта далёка не ўсё багацце лесу. Спецыялісты лесахімічнай галіны здольныя з драўніны здабыць каніфоль і шкіпінар. А гэта тыя асноўныя элементы, з якіх робяць лакі і фарбы, шыны, клеі і тэрмапластык для разметкі дарог.**

### Без шкоды для лесу

Уся справа ў жывіцы (смалістай масе, што выдзяляецца на хвойных дрэвах). Дарэчы, у краіне ёсць усяго адно прадпрыемства, якое ажыццяўляе працоўку жывіцы і вытворчасць з яе каніфолі і шкіпінару. Такая перапрацоўка драўніны з хімічным пераўтварэннем на парадак больш складаная, чым не звычайная распілоўка і вытворчасць з яе вырабаў. Міністэрства лясной гаспадаркі нават зацвердзіла спецыяльную інструкцыю, па якой нарыхтоўваецца жывіца. Згодна з ёй, тыя дрэвы, якія прызначаны для высечкі, за пяць гадоў да яе падсочваюцца дзеля здабычы гэтай сыравіны. Такім чынам, драўніну імкнуцца выкарыстоўваць беражліва і максімальна эфектыўна, а лесу не наносіцца ўрон, які нельга было б папоўніць.

«Сёння Беларусь з'яўляецца адзінай дзяржавай на постсавецкай прасторы, якая захавала тэхналогію нарыхтоўкі жывіцы і аднаўлення лесу», — адзначыў **кіраўнік кампаніі «Лесахімік» Аляксандр ЯКУШЭНКА.**

### Інвестыцыі на развіццё

Прадукцыя прадпрыемства знаходзіць сваё шырокае прымяненне ў галінах народнай гаспадаркі. Перш за ўсё, гэта шынная прамысловасць, якая спажывае асноўны аб'ём каніфолі. Прычым беларуская каніфоль выкарыстоўваецца для вытворчасці самых «адказных» шын — у авіяцыйнай прамысловасці, а таксама буйнагабарытных, якія праходзяць праз максімальныя нагрузкі. Попыт на айчынную прадукцыю лесахімічнай прамысловасці сёння немалы, і часам тыя магутнасці, якія мае прадпрыемства, няздольныя яго задаволіць. Таму, па словах Аляксандра Якушэнкі, у развіццё галіны за тры гады будзе ўкладзена каля 20 млн долараў. Ужо ў красавіку гэтага года «Лесахімік» пачаў рэалізацыю інвестыцыйнага праекта, які накіраваны на павелічэнне аб'ёмаў нарыхтоўкі і перапрацоўкі сасновай жывіцы. Ён разлічаны на тры гады. З гэтых сродкаў не менш як 15% будуць складаць уласныя грошы прадпрыемства. Астатнія плануецца пазычыць у банкаў: Банка развіцця, Беларусбанка і Белгазпрамбанка.

Цяпер рэалізуецца першы этап інвестпраекта — пашырэнне вытворчай базы за кошт уласных сродкаў прадпрыемства. Размова таксама ідзе аб новых участках здабычы жывіцы, закупцы інструментаў, спецадзення, аўтамабіляў, забеспячэнні неабходнага заробку персаналу. На гэта будзе выдаткавана каля 5 млн долараў. Другі этап праекта мае на мэце будаўніцтва тэхналагічных установак больш глыбокай перапрацоўкі жывіцы. Паводле папярэдніх ацэнак аб'ём інвестыцый павінен скласці каля 4,5 млн долараў. Для гэтага плануецца набыццё тэхнікі для падсочнай вытворчасці, рэактара для вытворчасці эфіраў каніфолі і іншага абсталявання. Праект на гэтым этапе прадугледжвае павелічэнне здабычы жывіцы да 8 тысяч тон у год. На трэцім этапе будзе праводзіцца арганізацыя перапрацоўкі сырога талавага масла на базе Светлагорскага ЦКК. У гэтым праекце аб'ём інвестыцый складзе каля 9 млн долараў.

### Пазбавімся ад імпарту і атрымаем новыя працоўныя месцы?

Сёлета, паводле інфармацыі прэс-службы канцэрна «Беллеспаперапрам», для нарошчвання аб'ёмаў нарыхтоўкі жывіцы засвавана тры ўчасткі на тэрыторыі Гомельскай і Гродзенскай абласцей, створана больш за 70 новых працоўных месцаў. Да канца года плануецца стварыць яшчэ 300 працоўных месцаў. Да работы далучацца лясгасы Брагінскага, Ельскага, Лоеўскага і Нараўлянскага раёнаў, якія падверглiся радыяцыйнаму забруджванню. Паводле даследаванняў Беллесаховы, узровень радыяцыі ў жывіцы з такіх раёнаў у 10 разоў меншы за дапушчальную норму. Уся справа ў тым, што жывіца значна менш назапашвае радыяцыю, чым драўніна.



Спецыялісты сцвярджаюць, што патэнцыял лесахімічнай галіны краіны вельмі вялікі і сёння выкарыстоўваецца яшчэ далёка не цалкам. З 124 тысяч гектараў ляснога фонду, прыдатнага для здабычы жывіцы, выкарыстоўваецца толькі 14 тысяч. Нягледзячы на такую вялікую перспектыву, прадстаўнікі кампаніі «Лесахімік» адзначаюць, што цяпер важна прыцягнуць спажыўцоў прадукцыі з жывіцы, якія сёння часцей закупляюць яе на знешніх рынках. Развіццё прадпрыемства забяспечыць высокі ўзровень імпартазамяшчэння, а таксама павелічэнне экспартных паставак.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

■ Грошы

# Стаўка рэфінансавання — 18%

**Сёлета з 17 жніўня былі зніжаны стаўка рэфінансавання з 20 да 18 працэнтаў гадавых і стаўкі па пастаянна даступных і двухбаковых аперацыях Нацыянальнага банка па падтрымцы бягучай ліквіднасці банкаў з 25 да 23 працэнтаў гадавых.**

Аб гэтым гаворыцца ў рашэнні Праўлення і Камітэта па манетарнай палітыцы Нацбанка, прынятым зыходзячы з аналізу дынамікі інфляцыйных працэсаў, стану плацежнага балансу і яго бягучага рахунку, сітуацыі на валютным і фінансавым рынках краіны. У прэс-службе рэгулятара паведамляюць, што ў чэрвені інфляцыя запаволілася да 12,1 працэнта ў гадавым выражэнні. Пры гэтым сярэднямесячны прырост спажывецкіх цэн у II квартале гэтага года склаў 0,5 працэнта (у аналагічным перыядзе 2015 года — 0,8 працэнта). Падобную тэндэнцыю паказвае таксама трэндавая інфляцыя, агрэгіраваны паказчык якой знізіўся ў чэрвені сёлета ў адносінах да чэрвеня мінулага года да 10,3 працэнта.

Спецыялісты Нацбанка паведамляюць, што дынаміка грашовых агрэгатаў стварае ўмовы для далейшага зніжэння інфляцыі. Прырост сярэдняй шырокай грашовай масы ў чэрвені ў гадавым вымярэнні склаў 14,1 працэнта. У паведамленні прэс-службы гаворыцца, што зафіксаванае ў першым паўгоддзі пашырэнне дэфіцыту рахунку бягучых аперацый плацежнага балансу было абумоўлена, перш за ўсё, пагаршэннем умоў гандлю энергетычнымі таварамі і падзеннем попыту на калійныя ўгнаенні. Пры гэтым у сферы знешнеэканамічнай дзейнасці, якая не залежыць ад кан'юнктурных фактараў, захоўваецца пазітыўны ўплыў мер эканамічнай карэкцыроўкі.

Эксперты Нацбанка адзначаюць, што сёлета з лютага фарміруецца чыстая прапанова замежнай валюты на ўнутраным валютным рынку, у тым ліку ў сегменце прадпрыемстваў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
18 ЖНІЎНЯ 2016 г.
ЧАЦВЕР
№ 15 (15799)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Open Space:

Імёны

# «Мы чужыя песні граем як свае»



**Той факт, што гурт, які не так даўно адсвяткаваў 10-годдзе, выдаў два поўнафарматныя альбомы, мае ўласную публіку, раптам змяніў канцэпцыю творчасці і замест уласных кампазіцый пачаў выконваць... кавер-версіі сусветных хітоў, можа падацца дзіўным. Але так сапраўды бывае. На пэўны перыяд часу досыць вядомая каманда Open Space адмовілася ад напісання новых песень і канцэртныя клубныя пляцоўкі змяніла на сцэны ў пабах і рэстаранах. Пра тое, чаму хлопцы рашыліся на такі досыць рызыкоўны крок і якім самі музыкі бачаць свой гурт у будучыні, у гутарцы з нашым карэспандэнтам разважаюць вакаліст Віталь МАЦІЕЎСКІ і гітарыст Арцём БУРАКІН.**

***— Юбілей — магчымасць, азірнуўшыся на пражытыя гады, падвесці пэўныя вынікі...***

**Віталь:** — Гэта былі сапраўды выдатныя 10 гадоў. Гады вопыту, вялікіх уражанняў, узлётаў і падзенняў. Яны прайшлі нездарма: мы запісалі два альбомы, рабілі кліпы — усё, як робяць нармальныя гурты. У нас аптымістычныя планы, гурт, як і раней, рэпеціруе тройчы на тыдзень.

***— Зараз вы ў асноўным выступаеце як кавер-бэнд, што досыць незвычайна для каманды, што ўжо мае свае песні...***

**Віталь:** — Гэта таксама этап. Я сапраўды спачатку крыху хваляваўся наконт пераходу ад выканання аўтарскіх кампазіцый да кавераў, але потым паглядзеў на справу з іншага боку і зразумеў, што гэта выдатны сцэнічны вопыт. Калі раней выступалі некалькі разоў на месяц, то цяпер маем намнога больш выступленняў. Мы значна выраслі. Для мяне гэты час — творчы адпачынак, нам трэба было зрабіць паўзу, каб зразумець, у якім кірунку гурту развівацца далей. Кавер — вельмі карысная рэч: калі існуеш у адных і тых жа ўмовах, пачынаеш ствараць аднатыпны матэрыял. А граючы каверы, глядзіш на розныя аранжыроўкі, вывучаеш новыя рашэнні ў вакальнай падачы, аналізуеш, чаму песня стала хітом. Для музыканта гэта вельмі важна. І сёння я разумею, што калі б мы зараз пачыналі, то гады два варта было б спачатку пайграць каверы і толькі потым заняцца ўласнай творчасцю. Эфект быў бы мацнейшым.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Прафесія на ўсе часы

# НА КРОК НАПЕРАДЗЕ

## Якім павінен быць настаўнік XXI стагоддзя?



Выпускнікі БДПУ разлятаюцца на размеркаванні, як піражкі ў базарны дзень. Ніхто без працы не застаецца...

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**«Ідэальны настаўнік — не шаблонная мадэль. Гэта цікавы, харызматычны, адукаваны чалавек, поўны творчай энергіі, які выхоўвае такіх жа актыўных, неабыякавых і мыслячых людзей», — такой думкі прытрымліваецца цяперашняя студэнтка Маскоўскага дзяржаўнага абласнога ўніверсітэта Гаар САРКІСЯН, якая вучыцца на настаўніка замежных моў. Адзінаццацікласніцай дзяўчына правяла невялікае даследаванне сярод вучняў сваёй гімназіі, іх бацькоў і педагогаў з мэтай параўнаць патрабаванні дзяржавы да дзелавых і асабістых якасцяў педагогаў (яны адлюстраваны ў прафесійным стандарце педагогаў), і чаканні грамадства ад школы. Наколькі яны супадаюць? Усім рэспандэнтам прапанаўвалася ў свабоднай форме адказаць на пытанне: «Якія якасці мусіць мець ідэальны настаўнік?»**

100% вучняў, якія прынялі ўдзел у апытанні, лічаць, што ідэальны настаўнік павінен быць строгім і цярплівым. Таксама ўсе вучні-рэспандэнты былі аднадушныя ў думцы, што настаўнік павінен умець зацікавіць вучэбным матэрыялам. 80% апытаных — за непрадузятае стаўленне з боку педагога і індывідуальны падыход («кожны хоча, каб яго ацэньвалі па справядлівасці і дапамагалі дасягнуць найлепшых вынікаў»).

Для ўсіх апытаных бацькоў ідэальны настаўнік — той, хто выдатна ведае свой прадмет. Як асобную якасць 100% бацькоў пазначылі «любоў да сваёй прафесіі і дзяцей» плюс неабыякавасць. Абсалютна ўсе апытаныя педагогі — за выдатнае веданне прадмета і цярплівасць. Да слова, найбольш уразілі старшакласніцу менавіта адказы педагогаў, калі высветлілася, што ў настаўніцкай практыцы здараецца мноства сітуацый, у якіх нeспрактыкаваны чалавек проста разгубіцца. Зрабіць з чалавека добрага настаўніка можа толькі неабыякавасць: калі ў цябе ёсць імкненне змяніць свет да лепшага, гэтая прафесія для цябе — такі вердыкт вынеслі педагогі...

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Пласты спадчыны

# ТРАГІЧНАЯ ГІСТОРЫЯ ГОРВАЛЯ

## РАЗГАДАЦЬ ЯЕ ДАПАМАГАЮЦЬ ШКОЛЬНІКІ

**Непадалёку ад Рэчыцы, там, дзе Бярэзіна ўпадае ў Дняпро, раскінулася вёска з прыгожай назвай Горваль. Акрамя назвы, населены пункт можа ганарыцца яшчэ і найцікавейшай гісторыяй. Амаль тысячу гадоў таму на яго месцы знаходзілася старажытнае славянскае паселішча, дзе працавалі рамеснікі, віравала жыццё... Нядаўна на месцы былога пасялення вяліся раскопкі, а дапамагалі археолагам вучні з тутэйшых школ. Нашы карэспандэнты наведаліся да юных гісторыкаў у госці...**

Жыхары вёскі даўно ведалі, што жывуць побач з гістарычнымі артэфактамі. Ды і як не ведаць, калі былое гарадзішча пачынаецца адразу за тваім дваром? Дастаткова зрабіць колькі крокаў за веснічкі, падняцца на адно ўзвышша, другое — і вось ты ўжо на месцы былога дзядзінца. Зараз у цэнтры пляцоўкі — роўная прамавугольная яма. Слой за слоем дзеці і дарослыя здымаюць «культурныя пласты», перабіраюць зямлю, чысцяць ад бруду знойдзенае...

— Насамрэч, каля вёскі знаходзяцца ажно дзве археалагічныя пляцоўкі, — гаворыць **аспірант кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Аляксандр ПЕТУХОЎ.** — Другая за два кіламетры на ўсход, на месцы былога Горвальскага замка XVI-XVII стагоддзяў. Пра тое збудаванне вядома больш, яно згадваецца ў шматлікіх крыніцах. Замак належаў самой каралеве Боне Сфорцы, якая выменяла яго на горад Ковель. Фартыфікацыя згарэла падчас Паўночнай вайны. А вось славянскае гарадзішча сур'ёзна вывучаецца, па сутнасці, упершыню. Мяркуецца, што гэта быў старажытнарускі Горваль, які згадваецца ў «Спісе рускіх гарадоў далёкіх і блізкіх» канца XIV стагоддзя. Якраз гэтаму падчас раскопак мы і знайшлі некаторыя пацвярджэнні: прасліца, шкляныя бранзалеты, якія з прыходам татар у Кіеў перасталі вырабляцца, значна старэйшыя за звычайныя сярэднявечныя вырабы з металу, кераміка...

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*



У лагеры ўсе працуюць аднолькава, незалежна ад полу і ўзросту.

Фота Надзеі БУЖАН.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
18 08 2016 г.

З «базай» у галаве

# АЗБУКА IT ДЛЯ БУДУЧЫХ ТРЭНЕРАЎ

**Першыя сертыфікаваныя трэнеры па праграмаванні ў асяродку Scratch былі падрыхтаваныя ў Парку высокіх тэхналогій.**

Адукацыйны праект «Праграмаванне — другая пісьменнасць» рэалізуецца адміністрацыяй Парка высокіх тэхналогій і Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь пры падтрымцы кампаній — рэзідэнтаў ПВТ. Яго мэта — фарміраванне і развіццё ў школьнікаў лагічнага і алгарытмічнага мыслення, базавых навыкаў праграмавання, навыкаў камунікацыі і працы ў камандзе. Падчас праекта былі распрацаваны навучальныя праграмы факультатыўных заняткаў «Творчая дзейнасць у асяродку праграмавання Scratch» (для вучняў 2—4 класаў) і «Стварэнне камп'ютарных гульняў на мове візуальнага праграмавання Scratch» (для 5—6 класаў). Дадзеныя праграмы зацверджаны Прэзідыумам Навукова-метадычнага савета пры Міністэрстве адукацыі і рэкамендаваны для выкарыстання ў адукацыйным працэсе.

Вучоба для будучых трэнераў з ліку школьных настаўнікаў прайшла па праграме, распрацаванай адукацыйным цэнтрам Парка высокіх тэхналогій. Па яе выніках слухачы атрымалі сертыфікат, які пацвярджае правы праводзіць навучанне па вучэбных праграмах «Азбука АйЦі» і «Лабараторыя гульняў».

Віншуючы першых трэнераў з паспяховым завяршэннем навучання, **намеснік дырэктара адміністрацыі ПВТ Аляксандр МАРЦІНКЕВІЧ** адзначыў, што ўжо ў верасні ў шэрагу беларускіх школ стартуюць факультатывы па вывучэнні Scratch: «Мы пачынаем з малога, але мэты нашы — глабальныя: у перспектыве размова ідзе аб стварэнні новага адукацыйнага асяроддзя, дзе развіццё лагічнага і алгарытмічнага мыслення стане неад'емнай часткай навучальных праграм».

— Калі Парк высокіх тэхналогій і міністэрства сумесна працавалі над ідэяй праекта, мы хутка зразумелі, што ён стане добрым інструментам у вырашэнні пастаўленых перад сістэмай адукацыі задач, — канстатаваў **першы намеснік міністра адукацыі Вадзім БОГУШ.** — Спецыфіка праекта такая, што ён дазваляе працаваць з дзецьмі з ранняга ўзросту, дапамагаючы іх развіццю. А атрыманыя школьнікамі навыкі спатрэбяцца ім усім, незалежна ад тых прафесій, якія яны ў будучыні выберуць.

Пафестывалім!

# РОБАТЫ — НЕ ПРОСТА ЗАБАЎКА

Першы фестываль па робататэхніцы «RoboFest» пройдзе ў сталіцы 16—18 верасня.

У яго праграме — інтэрактыўная выстава, навукова-папулярныя лекцыі, майстар-класы па робататэхніцы, 3D-мадэляванні і 3D-друку. Але галоўнае месца сярод мерапрыемстваў зоймуць спаборніцтвы па робататэхніцы, якія ўяўляюць сабой унікальную магчымасць для таленавітых дзяцей прадэманстраваць свае веды і ўменні ў гэтым кірунку.

Спаборніцтвы пройдуць у трох узроставых катэгорыях — да 12 гадоў, ад 13 да 15 гадоў і ад 16 да 18 гадоў. Юныя геніі павінны будуць самастойна стварыць робата і запраграмаваць яго мікракантролер для руху па плоскасці поля, рэагавання на светлавыя, каляровыя і ўльтрагукавыя сэнсары і пераадолення перашкод. Удзельнікі будуць не толькі працаваць над уласным праектам, але і прэзентаваць яго шырокай аўдыторыі. Ацэньваць іх намаганні будзе экспертнае журы — спецыялісты ў сферы робататэхнікі, інавацый і інфармацыйных тэхналогій.

Спаборніцтвы ў рамках «RoboFesta» могуць стаць першым крокам на шляху да будучай прафесіі ў IT-сферы. Удзел у мерапрыемстве — бясплатны. Ахвотным трэба толькі запоўніць форму рэгістрацыі і азнаёміцца з рэгламентам спаборніцтваў.

Арганізатары мерапрыемства — Парк высокіх тэхналогій, Адукацыйны цэнтр ПВТ, а таксама Eventspace (пляцоўка, якая аб'ядноўвае вядучых тэхналагічныя і прафесійныя суполкі Беларусі, IT-кампаніі і спецыялістаў).

# НА КРОК НАПЕРАДЗЕ

## Мужчынскі голас у «школьным аркестры»

Не сакрэт, што быў час, калі на педагагічныя спецыяльнасці і ў нашай краіне, і ў Расіі выпускнікі школ ішлі па рэштковым прынцыпе. Але ў апошнія гады сітуацыя пачала пакрысе выпраўляцца. Так, у расійскіх ВНУ сёлета конкурс на ўсе педагагічныя спецыяльнасці ў параўнанні з мінулым годам значна ўзрос, і ў першую чаргу — на факультэтах дэфекталогіі і пачатковых класаў. У Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка апошнія тры гады сярод абітурыентаў расце колькасць медалістаў, а таксама выпускнікоў ліцэяў і гімназій. Калі ў 2014 годзе ва ўніверсітэт прыйшло 100 медалістаў, у мінулым годзе — 132, то сёлета — 148. Плюс 22 медалісты будуць вучыцца на ўмовах аплаты.

**«Для мяне настаўнік — гэта чараўнік, сябра, творца, чалавек, у сэрцы якога знойдзецца месца для кожнага».**

Заўважна павялічыліся і прахадныя балы. Так, на спецыяльнасць «Лагапедыя» дзённай формы навучання прахадны бал вырас у параўнанні з мінулым годам на 50 пунктаў і склаў 323, на спецыяльнасць «Руская мова і літаратура. Замежная мова» — на 49 пунктаў (289). І такіх спецыяльнасцяў у БДПУ, дзе прахадныя балы выраслі на 20—50 пунктаў, — 80% ад агульнай колькасці.

— Педагагічная прафесія стала пераважна жаночай: 85% настаўнікаў у сістэме адукацыі — жанчыны. Аднак з задавальненнем хачу адзначыць, што сёлета ў нас на чатырох факультэтах істотна павялічыўся працэнт хлопцаў, — падкрэсліў **рэктар БДПУ, прафесар Аляксандр ЖУК.** — Найбольш іх прыйшло на факультэт фізічнага выхавання (каля 60%), на гістарычны факультэт (42%), фізіка-матэматычны (40%) і на факультэт прыродазнаўства — каля 30% ад агульнай колькасці залічаных. Нам яшчэ трэба асэнсаваць гэты феномен, каб зразумець, як прыцягнуць яшчэ больш хлопцаў ва ўніверсітэт. Напэўна, наша праца, як і намаганні СМІ па павышэнні прэстыжу педагагічнай прафесіі, прыносяць плён.

## Творца, мудры псіхолаг і справядлівы суддзя

Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт да свайго 100-годдзя праводзіў творчы конкурс на найлепшае сачыненне школьнікаў і студэнтаў пра настаўніка. Прачытаўшы конкурсныя работы, без праблем можна скласці «зборны» вобраз.

«Галоўнымі рысамі настаўніка з'яўляюцца здольнасць да разумення, цярплівасць і творчасць. Прафесія педагога не менш творчая, чым прафесія мастака ці пісьменніка, — лічыць выхаванка Капаткевіцкай сярэдняй школы Петрыкаўскага раёна Яніна Кухарава. — Сучасны настаўнік павінен быць гнуткім, мабільным, таму што з кожным годам рытм нашага жыцця паскараецца, паток інфармацыі расце. Настаўнік будучыні павінен ісці не ў нагу з часам, а на крок наперадзе. Для мяне настаўнік — гэта чараўнік, сябра, творца, чалавек, у сэрцы якога знойдзецца месца для кожнага. Гуманнасць, талерантнасць, настойлівасць і мабільнасць, адказнасць і адданасць сваёй прафесіі, крэатыўнасць і аптымізм — усё важна для таго, каб быць Настаўнікам з вялікай літары».

«...Гэта музыкант, які віртуозна грае на тонкіх струнах дзіцячай душы. І ад майстэрства педагога-музыканта залежыць, як будзе гучаць мелодыя...» — напісала Вераніка Ленская з Атраднаўскай сярэдняй школы Любанскага раёна.

«Сапраўдны настаўнік — гэта не толькі чалавек, які вучыць дзяцей. Ён і выхавальнік, і мудры псіхолаг, і справядлівы суддзя, выдатны імправізатар, артыст, хаця і не чакае апладысментаў» (Вікторыя Барысава, СШ № 2 г. Петрыкава).

«Які ён, педагог XXI стагоддзя? 1. Мудры, адукаваны, інтэлігентны, справядлівы настаўнік. 2. Ён ідзе ў нагу з часам, уключае ва ўрок інфармацыйныя тэхналогіі. 3. Гэта настаўнік-выхавальнік, якому неабыякавая будучыня планеты і міру на Зямлі. 4. Ён не стаіць на месцы, вывучае ўсё жыццё, пазнае новае. 5. Творчая асоба. 6. Гэта старэйшы сябра, памочнік, які паважае нас і наша меркаванне» (Аксана Кізун, СШ №25 г. Брэста).

«Быць настаўнікам — адна з найскладанейшых задач, таму што адзін чалавек павінен быць адначасова псіхолагам, навуковым работнікам, аратарам, акцёрам, арганізатарам. Адказнасць неверагодная: памылка педагога не настолькі заўважная як, напрыклад, памылка ўрача, але яна можа прывесці да непрадказальных наступстваў» (Анастасія Рагель, СШ №1 г. Валожына).

«Настаўнік — унікальная прафесія па-за часам, модай і геаграфіяй» (Марыя Сцефняк, гімназія №1 г. Жлобіна).

## Не практыкант, а Педагог

У новым навучальным годзе працаваць ва ўстановах адукацыі нашай краіны пачнуць 5800 маладых спецыялістаў, 580 з іх — у сталіцы. Як правіла, перад кожным маладым педагогам паўстае шэраг пытанняў. З чаго пачаць? Што сказаць вучням пры першай сустрэчы? Як наладзіць узаемаадносіны з дзіцячым калектывам? Як зрабіць бацькоў сваімі саюзнікамі?

**Аляксандра ЯЦЭВІЧ** у гэтым годзе скончыла інжынерна-педагагічны факультэт БНТУ і будзе выкладаць у 165-й сталічнай школе інфарматыку. Прызнаецца, што вельмі чакае першай сустрэчы са сваімі вучнямі. «Спадзяюся, што ў мяне ўсё атрымаецца: я гатова і да радасцяў, і да цяжкасцяў у стасунках з імі. Гатова і сама вучыцца ў дзяцей. Вельмі спадзяюся на добразычлівую атмасферу ў калектыве і дапамогу калег. Хацелася б стаць добрым настаўнікам, і я цудоўна разумею, што для гэтага трэба пастаянна самаўдасканальвацца», — прызнаецца без пяці хвілін малады педагог.

А вось у **настаўніцы рускай мовы і літаратуры 165-й мінскай школы Вікторыі СІНЮК** ужо маецца невялікі вопыт.

— Можна скончыць універсітэт з «чырвоным дыпломам», магістратуру, аспірантуру, як гэта было ў маім выпадку, але гэта яшчэ не гарантыя таго, што ты прыйдзеш у дзіцячую аўдыторыю і ўсё пойдзе як па маслe, — кажа яна. — Калі ты трапляеш у дзіцячы калектыў, то сутыкаешся са стыхіяй, якой трэба навучыцца кіраваць, а гэта вельмі няпроста.Трэба вучыцца ўстанаўліваць кантакт, улічваць індывідуальныя асаблівасці кожнай маленькай асобы, трэба чуць і прымаць іншага чалавека. Настаўнік павінен развівацца не толькі як прадметнік, але і як псіхолаг...

Спачатку ў мяне ўзнікалі складанасці ў ацэньванні, бо вельмі няпроста ацэньваць чужую працу і быць аб'ектыўнай. На мой погляд, у ацэньванні трэба быць вельмі справядлівым і ўлічваць асаблівасці і дынаміку развіцця кожнага вучня. У нас зараз дзейнічае 10-бальная сістэма ацэньвання, але насамрэч, калі вучань, які вучыўся на «двойкі», робіць поспехі, я не пашкадую самай высокай адзнакі, нават калі яго «дзясятка» і будзе адрознівацца ад «дзясяткі» выдатніка.

— Адна з праблем, з якімі сутыкаюцца ўсе маладыя спецыялісты, — гэта стасункі з бацькамі, аднак я заўважыла, што існуюць праблемы і ў стасунках бацькоў і дзяцей, — канстатуе маладая **настаўніца пачатковых класаў сярэдняй школы № 155 Мінска Марыя ДАРАШЭНКА.** — Таму паставіла для сябе задачу — згуртаваць калектыў не толькі дзяцей, але і іх бацькоў. Мы стварылі бацькоўскі клуб «Сям'я» і цягам года праводзілі сумесныя сустрэчы і мерапрыемствы накшталт «Калядных казак ля каміна».



Фота Надзеі НІКАЛАЕВАЙ.

— Кантрольна-ацэначная і тым больш безадзнакавая дзейнасць у малодшых класах выклікаюць цяжкасці нават у сталых педагогаў, а тым больш у пачаткоўцаў. Да праблем, з якімі сутыкаецца большасць маладых настаўнікаў, трэба аднесці і цяжкасці ў рабоце з дзецьмі з дэвіянтнымі паводзінамі, з бацькамі вучняў, таму што не заўсёды нават вопытны педагог здольны прымусіць бацькоў пачуць, што хоча данесці да іх настаўнік, — дзеліцца яна сваімі назіраннямі. — Да слова, мы праводзілі апытанне сярод маладых настаўнікаў, каб высветліць самыя важныя якасці сучаснага настаўніка. І вось што яны назвалі: творчасць, незалежнасць, канкурэнтаздольнасць, ініцыятыўнасць, маральнасць і духоўнасць, мабільнасць, адказнасць, прафесіяналізм, кампетэнтнасць у галіне тэхналогій...

**«Вельмі няпроста ацэньваць чужую працу і быць аб'ектыўнай».**

— У сучасным свеце дзіця можа знайсці любую інфармацыю, але пакуль яшчэ не прыдумалі камп'ютар, які навучыць яго аналізаваць, параўноўваць, мысліць лагічна і рабіць высновы, — упэўнены малады **настаўнік гісторыі 165-й сталічнай школы Андрэй АРСЯНОВІЧ.**

Трэба прызнаць, што інтэрнэт па сіле ўплыву на маладых людзей істотна пераўзыходзіць магчымасці сучаснага настаўніка, а падручнік перастаў быць галоўным сродкам навучання. «Таму настаўнік не можа быць проста транслятарам ведаў, ён павінен быць кансультантам, памочнікам, сябрам дзяцей. Задача настаўніка — даць аснову, абудзіць цікавасць да свайго прадмета і навучання ўвогуле, навучыць вучня самастойна здабываць веды, аналізаваць, і, магчыма, самае важнае — сфарміраваць стрыжань асобы дзіцяці, — упэўнены рэктар БДПУ Аляксандр Жук. — Цяпер наш універсітэт распрацоўвае прафесійны стандарт педагога, у якім мы прапісваем новыя кампетэнцыі, звязаныя з IT-тэхналогіямі і працай з сям'ёй у новых умовах».

## «Вайбер» — для кантактаў з бацькамі...

У мінулым навучальным годзе ў сталіцы дзейнічалі пяць школ маладых педагогаў па розных прадметах. Адну з іх узначальвала **намеснік дырэктара сярэдняй школы №165 Ніна Дзмітрыеўна ХАЦЯН.**

Цікава, што маладыя настаўнікі ўжо прыдумалі, як паставіць сабе на службу новыя тэхналогіі. Вось іх «рэцэпт»: паколькі вучні не заўсёды даносяць да сваіх бацькоў важную інфармацыю, можна стварыць групу ў «Вайберы» і кантактаваць там з бацькамі без пасрэдніцтва дзяцей у любы зручны для ўсіх час. Пры гэтым уласныя старонкі ў сацыяльных сетках маладыя настаўнікі лічаць сваёй тэрыторыяй і не пускаюць на яе ні вучняў, ні іх бацькоў. Усё ж такі пэўныя бар'еры ў стасунках павінны захоўвацца...




(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Матэрыялы паласы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА. nikalaeva@zviazda.by

СУМЕСНЫ ПРАЕКТ
БРСМ СКАРБОНКА ДОБРЫХ СПРАЎ
ЧЫРВОНКА

# Гэты дзень аб'яднаў неабыякавых

**У Магілёўскай вобласці прайшоў Дзень дабра, арганізатарам якога выступіла абласная арганізацыя грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі». Валанцёры руху БРСМ «Добрае Сэрца» арганізоўвалі ў розных кутках Магілёўшчыны працоўныя і экалагічныя акцыі, дапамагалі ветэранам і адзінокім пажылым людзям, наведвалі дзяцей-сірот, дзяцей-інвалідаў і шматдзетныя сем'і. Акрамя таго, у гэты дзень у гандлёвых цэнтрах ЦУМ і «Прэстан» Магілёва, а таксама ў раённых цэнтрах валанцёры арганізавалі збор школьных прылад, спартыўнага інвентару для дзяцей з маламаёмных сем'яў.**

Завяршыўся Дзень дабра Рэспубліканскім дабрачынным марафонам «Усе фарбы жыцця для цябе» з удзелам валанцёраў «Добрае Сэрца»: фіналіста нацыянальнага адборачнага тура «Еўрабачанне-2016» гурта «Nani», маладых выканаўцаў — Аляксандры Няхай, Эліны Матарас, Улада Лужынскага, Ангеліны Піпер, Іны Гаўрылюк, Ягора Тамелы, а таксама маладзёжных і дзіцячых творчых калектываў Магілёўшчыны.

У гэты дзень аб'ектам асаблівага клопату валанцёраў сталі выхаванцы Цэнтра карэкцыйнага развіцця, навучання і рэабілітацыі з пасёлка Глуск — 19 дзяцей-сірот ва ўзросце ад аднаго да 15 гадоў, малыя з няпоўных і апякунскіх сем'яў з такімі захворваннямі, як сіндром Дауна, дзіцячы цэрэбральны параліч, аўтызм, разумовая адсталасць і фізічная недастатковасць рознай ступені, затрымка псіхаматорнага развіцця.

Усе атрыманыя падчас дабрачыннага марафону сродкі — амаль 20 мільёнаў рублёў старымі — будуць накіраваны на набыццё неабходнага спартыўнага абсталявання і абсталявання для сэнсарнага пакоя (масажоры, трэнажоры, цацкі для развіцця дробнай маторыкі, развіццёвыя дыдактычныя дапаможнікі, фітболы і г.д.) гэтай сацыяльнай установы.

**ДАВЕДКА.** У Магілёўскай вобласці дзейнічае больш за 283 валанцёрскія атрады агульнай колькасцю 3597 добраахвотнікаў. У 2016 годзе ў рамках праекта «Аднаўленне святынь Беларусі» ў Магілёўскай вобласці было добраўпарадкавана больш за 30 культавых аб'ектаў, на якіх былі задзейнічаны 64 валанцёрскія атрады агульнай колькасцю 460 чалавек.

Мерапрыемствы дабрачыннага марафону «Усе фарбы жыцця для цябе» сёлета адбыліся 13 мая ў Івацэвічах Брэсцкай вобласці, 4 чэрвеня — у Мінску.




*У дапамогу выпускнікам*

# АД ВУЧНЁЎСКАГА МЕСЦА ДА ПАСТАЯННАГА

## Асвоіць прафесію дапамагае «Маладзёжная практыка»

**«На вучнёўскія рабочыя месцы, створаныя наймальнікамі па праграме "Маладзёжная практыка", у студзені—чэрвені бягучага года працаўладкаваны 332 беспрацоўных выпускнікі», — паведамілі ва ўпраўленні палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Гадавое заданне ў цэлым па краіне выканана на 61,5 працэнта. Большасць «практыкантаў» асвойваюць рабочыя прафесіі.**

На «Маладзёжную практыку» накіроўваюць беспрацоўных выпускнікоў устаноў прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, а таксама беспрацоўных, якія прайшлі навучанне па накіраванні службы занятасці. Праграма нацэлена на набыццё маладымі людзьмі прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў практычнай працы на вытворчасці, якія павышаюць іх канкурэнтаздольнасць на рынку працы. У якасці стымулу наймальнікам, якія даюць вучнёўскія рабочыя месцы для «практыкантаў», часткова кампенсуюць затраты на аплату іх працы. Так, са сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва кампенсуюць расходы па зарплаце работніка ў перыяд праходжання «Маладзёжнай практыкі» ў памеры мінімальнай заработнай платы і абавязковых страхавых узносаў.

Адна з навацый закона «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь» "Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь», які ўступае ў сілу з 23 кастрычніка гэтага года — пашырэнне кола «практыкантаў». У гэтай праграме змогуць удзельнічаць жанчыны-маці, якія працяглы час не працавалі ў сувязі з доглядам дзіцяці да 3 гадоў. Дзяржаўнай праграмай аб сацыяльнай абароне і садзейнічанні занятасці насельніцтва на 2016—2020 гады прадугледжваецца, што ў бягучым пяцігоддзі па праграме «Маладзёжная практыка» будуць працаўладкаваны як мінімум 2 590 чалавек, у тым ліку ў 2016 і 2017 гадах — па 540 чалавек.

Нагадаем, што «Маладзёжная практыка» арганізуецца на вучнёўскіх рабочых месцах, якія ствараюцца прадпрыемствамі незалежна ад формаў уласнасці, за выключэннем бюджэтных. Перавагу маюць наймальнікі, якія забяспечваюць далейшае працаўладкаванне моладзі на пастаянныя рабочыя месцы. З беспрацоўным, накіраваным службай занятасці на вучнёўскае працоўнае месца, наймальнік заключае тэрміновы дагавор да шасці месяцаў, складае і ўзгадняе індывідуальны навучальны план. Асаблівая ўвага надаецца замацаванню працоўных рэсурсаў на вёсцы, у малых гарадах і пасёлках гарадскога тыпу. З гэтай мэтай тэрмін праходжання «Маладзёжнай практыкі» павялічаны да 1 года для беспрацоўных жыхароў сельскай мясцовасці і малых гарадоў (у мінулым годзе такіх «практыкантаў» налічвалася адпаведна 70 і 111 чалавек). А ўсяго летась на «Маладзёжную практыку» былі ўладкаваны амаль 600 беспрацоўных выпускнікоў, у 2014 годзе — 767.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

*Ідэі маладых*

# ДАЕШ РЭЛАКС ПА-НОВАМУ,

## ці Што вы ведаеце пра капсульны адпачынак?



**ПАДЧАС фіналу рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу «100 ідэй для Беларусі», дзе юныя вынаходнікі прадстаўлялі на ўсеагульны агляд больш за сотню праектаў: альтэрнатыўныя крыніцы энергії, робататэхніку і інш., мяне асабліва ўразіў праект рэлакс-капсулы студэнткі другога курса эканамічнага факультэта БДУ. Адразу падумала: як было б цудоўна, каб такія боксы з'явіліся і ў нашай рэдакцыі! Захацеў адпачыць і набрацца сіл — палажыў там колькі хвілінак і з новым запалам за працу. А можа, мая мара хутка споўніцца? Пра гэта я спытала ў аўтара праекта Алены КУРАНАВАЙ.**

— На жаль, у конкурсе я не перамагла. Грант у 120 мільёнаў недэнамінаваных рублёў уручылі хлопцам з МНС за распрацоўку адмысловай прылады для тушэння пажараў.

Але маім праектам зацікавіліся патэнцыйныя інвестары з Беларусі і Венгрыі. Я аддала перавагу айчыннаму. Ён папрасіў скласці бізнес-план, распісаць, з чаго будуць пабудаваны капсулы, дзе іх можна размясціць. І, самае галоўнае, акрэсліць, як з гэтых «скрынак» атрымаць прыбытак. Зараз я займаюся разлікамі. Не так даўно размаўляла з адміністрацыяй парку культуры і адпачынку імя Чалюскінцаў, магчыма, першыя капсулы з'явяцца менавіта там. Адзін бокс можна зрабіць за 700 долараў. Сакрэт у тым, што капсулу можна вырабіць з керамзіту — лёгкага порыстага матэрыялу. Але пакуль яна існуе толькі ў выглядзе макета. Адзначу, што для краін СНД мая капсула — гэта ноу-хау.

***— Чытала, што падобныя «скрыні здароўя» вельмі папулярныя ў Кітаі і Японіі. У чым унікальнасць тваёй распрацоўкі?***

— За мяжой боксы грувасткія і дарагія: ад 12 да 60 тысяч долараў. Мая распрацоўка — больш кампактная і ўтульная, і, галоўнае, у 60 разоў таннейшая за замежныя аналагі з-за таннага матэрыялу.

***— Алена, як у цябе з'явілася гэтая ідэя?***

— Мой выкладчык неяк згадаў пра капсулы адпачынку, што ратуюць чалавека ад гарадской мітусні. І я «загарэлася»: а чаму б не зрабіць такія «цуда-скрыні» ў нас? Разлікі і складанне мадэлі занялі шэсць месяцаў. Каб дайсці да фіналу конкурсу, мне давялося «прабіцца» праз пяць этапаў: пачынаючы са свайго факультэта і заканчваючы абласным этапам.

Рэлакс-капсулу можна размясціць у аэрапортах, на вакзалах і прадпрыемствах. Адпачынак можна было б зладзіць нават паміж парамі! А адна з функцый дазволіла б праслухаць у ёй лекцыю або музыку.

Апарат за 10-20 хвілін верне арганізму бадзёрасць і сілы. У боксе можна будзе памераць ціск і вызначыць пульс. Максімальна расслабіцца дапаможа водаратэрапія, светлавыя эфекты і прыемная музыка. У боксе можна будзе падключыцца да Wi-Fi, падзарадзіць тэлефон і планшэт.

***— І колькі, па тваіх разліках, будзе каштаваць паслуга?***

— Гэта будзе залежаць ад таго, колькі кліент захоча адпачываць у аздараўляльным апараце. Лічу, хвілін за 15-20 можна будзе браць 3 рублі. Сёння гэта кошт кубачка кавы. Праўда, я не ведаю, якая рэакцыя будзе на «скрыні здароўя» ў беларусаў і ці захочуць яны плаціць за такі адпачынак. Мы неяк з недаверам ставімся да навінак... Але час пакажа. Спадзяюся, праект не «завісне» на паперы.

**Хрысціна ХІЛЬКО.**




# ХТО КАГО ЛОВІЦЬ?

**Памятаю, калі мне было гадоў дзесяць, я спяшаўся са школы дадому, каб паглядзець чарговую серыю мультфільма пра Эша і яго кішэннага сябра Пікачу. Дваццаць хвілін радасці штодзень! Але ўсё прыемнае калі-небудзь заканчваецца. Скончыўся і мультсерыял. Праз некалькі гадоў пра пакемонаў пачалі забываць, а неўзабаве з'явілася пакаленне дзяцей, для якіх вобраз жоўтага зайца з чырвонымі шчокамі (стваральнікі чамусьці сцвярджаюць, што гэта мыш) роўным чынам нічога не азначае. Але ў выніку франшыза вярнулася, прычым, здаецца, яшчэ больш трыумфальна, чым раней. Цяпер усе спяшаюцца не да тэлевізара, а... пахадзіць па горадзе, уткнуўшыся ў экран смартфона.**

Усё пачалося ў 2012 годзе: кампанія Niantic Labs выпусціла для смартфонаў гульню Ingress, пабудаваную на прынцыпах дапоўненай рэальнасці. Сумяшчэнне рэальнага і віртуальнага прыйшлося аўдыторыі даспадобы, а забава займела даволі вялікую папулярнасць. Як аказалася, праект быў толькі падмуркам для нечага большага. Скарыстаўшыся дадзенымі з Ingress, усё тая ж кампанія стварыла новы прадукт аналагічнай канцэпцыі, але гэтым разам пабудавала ўсё ў гульнявым свеце паўзабытых Pockemon. Цяпер кожны можа стаць Эшам з анімэ 90-х! Скажу шчыра, напачатку задума мне спадабалася. Нарэшце нехта змог падняць зацятых геймераў з крэслаў і выцягнуў іх на вуліцу! Няхай падыхаюць свежым паветрам, пабачаць свет...Але аказалася, што рэальнае асяроддзе надта агрэсіўнае для заўзятых гульцоў у Pockemon Go.

Цэлы шэраг здарэнняў, у тым ліку і трагічных, пачаў адбывацца ў самых розных кутках зямлі. Дзесьці лаўцоў пакемонаў прынялі за зладзеяў і абстралялі, у іншым месцы надта захопленыя экранам смартфона гульцы не заўважылі небяспеку... Pockemon Go стала адной з галоўных інфармацыйных нагод лета, прычым далёка не заўсёды радасных. Некаторыя арганізацыі аператыўна адрэагавалі на новы трэнд: РУП «Мінскэнерга», напрыклад, размясціла ў сваім «Фэйсбуку» папярэджанне аб тым, што шукаць пакемонаў побач з энергетычнымі аб'ектамі смяротна небяспечна.

Вядома, адразу ж зайшла размова пра тое, што небяспечную гульню трэба неяк заканадаўча абмежаваць ці нават зусім забараніць. З усіх бакоў гучаць папрокі: маўляў, ну які нармальны чалавек будзе ўвесь свой час праводзіць, ловячы віртуальных монстраў? Асаблівa вылучаюцца прадстаўнікі старэйшага пакалення, якія адпускаюць з'едлівыя жарты пра гульцоў. У адказ чуюць: «Як пакаленне, якое заряджала ваду каля тэлевізара пад выступленне Чумака, можа смяяцца з пакалення, якое ловіць пакемонаў?» У кожнай генерацыі свае забабоны, пытанне толькі ў канкрэтных людзях. Ёсць жа старая беларуская прыказка пра дурня, якога прымушаюць Богу маліцца. Вось і разбіваюць сабе зацятыя аматары Pockemon Go ілбы, смартфоны, ламаюць канечнасці. А старэйшыя з вялікім задавальненнем па-свойму далучаюцца да гульні: у Расіі, напрыклад, казакі шукаюць на вуліцах гарадоў лаўцоў і праводзяць з тымі «выхаваўчыя» размовы. Пагадзіцеся, не менш дзіўны занятак...

Я не прыхільнік розных канспіратыўных тэорый (часам можна пачуць думкі, што Pockemon Go — гэта ледзь не шпіёнская праграма, якая збірае дадзеныя пра мясцовасць і асабістае жыццё гульцоў), і без іх відавочна, што стаіць за новым трэндам. Самыя розныя кампаніі пачалі карыстацца гульнёй для сваіх акцый. Кавярні і рэстараны размяшчаюць так званыя lure-модулі ў сваіх памяшканнях, прыцягваючы ўвагу наведвальнікаў, іншыя выпускаюць спецыяльныя аксесуары для «палявання» на пакемонаў, банкі прапаноўваюць гульцам страхоўкі... Адна з беларускіх сетак аўтазаправак ужо прапаноўвае кліентам набываць пернікавых пакемонаў і атрымліваць за гэта падарункі. Калі ёсць магчымасць зарабіць на новай хвалі папулярнасці «кішэнных монстраў», чаму б гэтага не зрабіць? Галоўнае, каб была зацікаўленая публіка, а «паляўнічыя» на яе знойдуцца. Толькі хто каго ў такім выпадку ловіць?..

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

*Карысны досвед*

# НА ПРАЦУ Ў САД,

## ці Як на свежым паветры сяброўства мацнее

**Які студэнт не мае патрэбы ў грошах? Правільна, той, хто ўмее іх зарабляць. Найлепшы час для падпрацоўкі — лета. Але ж хочацца яшчэ і нацешыцца цёплым сонейкам, а як гэта сумясціць? Аказваецца, проста. Мы правялі адзін дзень у сельскагаспадарчым студэнцкім атрадзе.**

Сёлета да ўборачнай кампаніі ў Агракамбінаце «Ждановічы» далучыліся студэнты БДУ. Маладыя людзі працуюць на зборы яблыкаў і груш. Усяго ў атрадзе каля сарака чалавек. Працоўны дзень пачынаецца ў восем гадзін раніцы, але, па словах майго праваднiка Валдыса Аляшкевічуса, студэнта трэцяга курса геаграфічнага факультэта, ранні пад'ём — не праблема, наадварот, гэта добрая загартоўка напярэдадні навучальнага семестра. З дыспетчарскай станцыі гарадскога пасёлка Азярцо, што ў некалькіх кіламетрах ад Мінска, службовы аўтобус забірае работнікаў і вязе іх на базу. Праз 15 хвілін транспарт заязджае ў двор — мы прыбылі ў сад «Яркава». Пасажыры пакідаюць транспарт і хуценька пераапранаюцца. Па дарозе даведваюся, што нам сёння пашанцавала, бо мы тут жа і застанёмся працаваць. За дваццаць кіламетраў ад вёскі Яркава ў аграгарадку Новы Двор знаходзіцца другі сад агракамбіната. Звычайна работнікаў адвозяць на базу, каб тыя пераапрануліся, а потым вязуць туды.

**У дзень атрад збірае 4—5 тон пладоў. Але гэта яшчэ не сезон — у верасні пачнецца самая праца.**

Нарэшце ўсе гатовыя, застаецца чакаць распараджэнняў адказнага за студатрад агранома. Той камандуе ўзяць пладовыя сумкі, пальчаткі, распісацца за тэхніку бяспекі і рухацца за ім. І тут перад вачыма адкрываецца маляўнічы пейзаж — доўгія шэрагі дрэў, абвешаныя спелымі яблыкамі, нібы каштоўнымі камнямі. Неверагодная прыгажосць!

— Здымаць яблыкі трэба ўмець, — тлумачыць **Яўген ЖУРАЎЛЁЎ, спецыяліст па ягадных культурах агракамбіната «Ждановічы»**. — Напрыклад, возьмем амерыканскі гатунак «Голд Міленіум». Калі на плод моцна націснуць, застаецца пляма — на продаж такі ўжо не пойдзе. Нельга з сілай цягнуць на сябе галінку, трэсці, таму што пасыплюцца плады зверху. Тое, што ўпала на зямлю, сартуецца ў асобную скрыню, яе змесціва пойдзе на кампоты і пюрэ. Калі яблык вісіць на дрэве ўжо чарвівы, з гнілцю, — зрываем і кладзём туды ж. Правільна здымаць яблык трэба круцячым рухам, акуратна, без грубых націсканняў. У дзень атрад збірае 4—5 тон пладоў. Але гэта яшчэ не сезон — у верасні пачнецца самая праца.

Праз дзве з паловай гадзіны было нагружана дзевяць драўляных скрынь, кожная ўмясціла 350 кілаграмаў яблыкаў. Пакуль плады адвозіліся ў сховішча, хлопцы і дзяўчаты размясціліся на траве і ладзілі гульні. Але ўбачыўшы, што набліжаецца трактар з пустым прычэпам, тут жа зноў узяліся за справу.

— Я даўно ўжо хацеў недзе падпрацаваць, але то вучоба замінала, то асабістыя справы. Набліжалася лета, і я вырашыў сур'ёзна падысці да гэтага пытання. Звярнуўся ў БРСМ, там мне прапанавалі на выбар сервісны, будаўнічы або сельскагаспадарчы атрад. Апошні мне падаўся найбольш прывабным. Па-першае, гэта свежае паветра, цяпер я лепш сплю, не баляць вочы ад камп'ютара. Па другое, гэта магчымасць падтрымаць фізічную форму. Поўная пладовая сумка важыць кілаграмаў пяць, вось пацягаеш яе дзень на сабе, панагінаешся туды-сюды, дык і прэс з'явіцца. Ну і, вядома, вітаміны, яблыкаў пяць-шэсць за дзень з'ясі, — дзеліцца Ігар Мордас, студэнт трэцяга курса механіка-матэматычнага факультэта.

Неўзабаве да гутаркі далучаецца Марына Ануфрыева, студэнтка чацвёртага курса геаграфічнага факультэта:

— А вось як па мне, дык цягаць такія цяжкія сумкі — не дзявочая справа. У канцы дня спіну ломіць... Што казаць, умовы ў нас тут самыя што ні на ёсць палявыя. У гэтым садзе яшчэ добра, што прыбіральня прадугледжана, а ў Новым Дворы і таго няма.

Анастасія Гурына, студэнтка трэцяга курса біялагічнага факультэта падказвае, што не апошнюю ролю ў матывававанасці студэнтаў адыгрывае магчымасць пасля працы атрымаць месяца ў інтэрнаце. Са слоў дзяўчыны, размеркаванне на гэта могуць не ўсе, а толькі камандзіры і камісары груп. Атрад умоўна падзелены на невялікія групы па 6-8 чалавек, у кожнай з іх універсітэцкі аддзел БРСМ прызначае двух лідараў, якія акрамя агульнай працы павінны сачыць за парадкам. Усяго ў атрадзе 12 чалавек маюць такі прывілей.

...Надышоў час абеду. Усе ўжо паспелі стаміцца, прагаладацца, і камандзір дае адмашку на заслужаны адпачынак. Хлопцы і дзяўчаты ўладкоўваюцца хто дзе, раскладваюць прывезеную з дому ежу. Паветра напаўняецца пахучымі водарамі. Я тым часам накіроўваюся да **Аляксандра БАЛДЗІСАВА, начальніка цэха садаводства агракамбіната «Ждановічы»**, каб даведацца пра заробкі моладзі.



— Мы не вядзём асобны табель выніковасці па кожным студэнце. Яны ўсе працуюць на агульны вынік. У канцы працоўнага дня запісваем адну лічбу, якая паказвае, колькі пладоў сабраў атрад, а потым ужо дзелім на колькасць задзейнічаных у ім чалавек. Замест канкурэнцыі — таварыства, такі наш падыход. **За дзень кожны зарабляе каля 20 рублёў.** Выхадныя дні аплачваюцца ўдвая. Яны не абавязаны выходзіць на працу кожны дзень, але пакуль жнівень, вучобы няма, дык стараюцца наведвацца як мага часцей. Далей, напэўна, будуць прыязджаць толькі па выхадных днях. Наогул, я ўжо і не прыгадаю, калі студэнты вось так добраахвотна ішлі да нас на працу. Летась у межах практыкі працавалі студэнты аграрна-тэхнічнага ўніверсітэта і навучэнцы Навапольскага аграрна-тэхнічнага каледжа, але ж гэта прымусова, ім трэба было сесію «закрыць». А тут самі падахвоціліся, працуюць добра, можа, не так хутка, як хацелася б, але затое акуратна.

Працоўны дзень заканчваецца у 16.00. Моладзь зноў пераапранаецца, здае інвентар, а кіраўніцтва агучвае вынік працы. Стомленыя, але задаволеныя, што дзень прайшоў нездарма, студэнты вяртаюцца дадому. Заўтра зноў на працу — і так да 1 кастрычніка. Але яны не скардзяцца, а па дарозе плануюць сумесны пікнік...

**Алена ЯКАВЕНКА.**

*Спартыўная вікторыя*

# ХТО САМЫ СПРЫТНЫ І МЕТКІ?

**Спартыўны фестываль для ўдзельнікаў сталічных студэнцкіх атрадаў прайшоў пад Мінскам, на тэрыторыі загараднага комплексу «Камарова». Арганізатарам мерапрыемства выступіла Мінская гарадская арганізацыя грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».**

Удзел у спаборніцтвах прынялі 18 каманд — 9 дружын прадстаўлялі студэнцкія будатрады і яшчэ 9 складаліся з навучэнцаў каледжаў і гімназій раённаў Мінска.

Моладзь змагалася ў дартсе, пад'ёме на хуткасць па скаладроме, у перацягванні каната, дэманстравала тактычныя навыкі падчас праходжання паласы перашкод.

А фінальным акордам фестывалю стаў турнір па лазертагу па алімпійскай сістэме. Вось дзе разгарнуліся сапраўдныя баталіі! На «полі бою» — буралом, зламаныя аўтамабілі, бетонныя пліты і шыны... Нягледзячы на гэта, усе выкладваліся напоўніцу.

У выніку першае месца сярод каманд ВНУ занялі прадстаўнікі Беларускага дзяржаўнага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта, а сярод раённых дружын вікторыю святкавала моладзь з Партызанскага раёна сталіцы.

**Для даведкі:** у трэцім працоўным семестры з дапамогай структур Мінскага гарадскога штаба студэнцкіх атрадаў у складзе студэнцкіх атрадаў працаўладкавана больш за 6 тысяч байцоў. А ўсяго ў планах — працаўладкаваць да 10 тысяч чалавек. Атрады, якія складаюцца са студэнтаў і навучэнцаў сталічных устаноў адукацыі, задзейнічаны на знакавых аб'ектах: будаўніцтве трэцяй лініі Мінскага метрапалітэна, на МКАД-2, у Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень».

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# ТРАГІЧНАЯ ГІСТОРЫЯ ГОРВАЛЯ



**Кульмінацыя дня — чарговая знаходка!**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Гісторык кажа, што многія артэфакты раскрываюць трагічную старонку ў гісторыі старажытнага Горваля. На невялікім участку былі знойдзены рэшткі пяці чалавек, у тым ліку дзяцей. Гэтыя людзі не былі пахаваны, пра што сведчаць іх ненатуральныя позы. Хутчэй за ўсё, на паселішча напалі ворагі, якія не пашкадавалі яго жыхароў. Сляды ў гліне і шматлікія наканечнікі стрэл падштурхоўваюць да думкі аб раптоўным захопе і спаленні Горваля. На думку навукоўцаў, рабаўнікамі былі мангола-татары.

**Дапамога дзяцей прыйшлася да месца: аб'ёмы працы вялікія, а юнацкі імпэт і энергічнасць заўважна паскараюць работу.**

Раскопкі распачаліся ў пачатку жніўня, кіраваў імі прафесар кафедры гісторыі Беларусі і паліталогіі Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Сяргей Рассадзін. Спачатку каманда ў складзе двух навукоўцаў, аднаго мясцовага краязнаўцы і дзясятка школьнікаў працавала на замкавым гарадзішчы, пазней перамясцілася на больш старажытную пляцоўку. Усе раскопы вядуцца па тэхналогіі: участкі разбіваюцца на квадраты, кожны з іх апрацоўваецца паслойна, пасля закопваецца. Па прызнанні Аляксандра Петухова, дапамога дзяцей прыйшлася да месца: аб'ёмы працы вялікія, а юнацкі імпэт і энергічнасць заўважна паскараюць работу.

**«Ужо сфарміраваўся асноўны касцяк дзяцей-актывістаў, якім праца прыйшлася даспадобы, прымушаць нікога не трэба. Мяркую, што пару-тройку будучых гісторыкаў ці археолагаў мы ўжо выхавалі».**

— Ідэя такога праекта ў нас узнікла даўно, гады тры таму, — распавядае **намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Глыбаўскай сярэдняй школы Ірына НЯВОЛЬКА**. — Але летась усё нарэшце склалася: вясною на нас выйшлі прадстаўнікі Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, і мы пачалі рыхтавацца да адкрыцця міжшкольнага аздараўленчага лагера «Кентаўрык». У яго склад увайшлі вучні трох школ: першай і другой азершчынскай, а таксама глыбаўскай. Усяго тут 15 дзяцей з 9-11 класаў, але раскопкі наведваюць і многія энтузіясты, напрыклад выпускнікі нашай школы. Усё робіцца на добраахвотнай аснове, грошай дзеці не атрымліваюць. Пры падтрымцы раённага і абласнога выканаўчых камітэтаў арганізаваны падвоз на школьным аўтобусе і харчаванне. Ужо сфарміраваўся асноўны касцяк дзяцей-актывістаў, якім праца прыйшлася даспадобы, прымушаць нікога не трэба. Мяркую, што пару-тройку будучых гісторыкаў ці археолагаў мы ўжо выхавалі.

Працуюць юныя археолагі з 9 да 13 з перапынкамі на 15 хвілін кожную гадзіну — больш не дазваляе заканадаўства. Разам з імі ў летніку знаходзяцца пяцёра школьных педагогаў.

— Я заўжды марыла пабываць на раскопках і некалі нават планавала паступаць на гісторыка, — кажа **адзінаццацікласніца Азершчынскай школы №1 Ганна ВАРОНА**. — Дзякуючы летніку мая мара спраўдзілася. Мне тут падабаецца, гэта незвычайна — шукаць у зямлі рэчы, якім сотні гадоў. А якія эмоцыі перажываеш, калі нешта знаходзіш, — не перадаць! Працу мы асабліва не дзелім, капаюць усе, у тым ліку і дзяўчаты. Хаця хлопцы, безумоўна, паспяваюць больш.

— Мне пра летнік распавяла наша завуч, — дадае яе аднакласніца **Ганна КАЛЕСНІК**. — Дома летам сядзець не хацелася, я палічыла, што тут будзе цікава. Шчыра скажу, не прагадала: не кожны дзень можна трапіць на сапраўдныя раскопкі і патрымаць у руках каштоўныя артэфакты. Акрамя таго, прафесар Рассадзін распавядае нам шмат цікавых рэчаў з гісторыі Беларусі...

Заўважна, як бурна дзеці рэагуюць на любыя знаходкі і рэчы, як прафесіянальна ставяцца да іх. Усё гэта — навуковыя артэфакты, якія апісваюцца ў дакументах і перавозяцца на захаванне ў мясцовы фельдшарска-акушэрскі пункт. Нават шкілеты старажытных горвальцаў юных гісторыкаў не пужаюць.

— Падобныя атрады ўжо некалі працавалі ў Светлагорскім раёне, пад Оршай, — распавядае **другі сакратар ЦК БРСМ Сяргей КЛІШЭВІЧ**, з якім мы наведалі археалагічны лагер. — Гэта было даўно, на пачатку 2000-х. Вельмі сімвалічна, што менавіта ў Год культуры мы змаглі аднавіць такую практыку і стварылі добраахвотніцкі атрад у Рэчыцкім раёне. На мой погляд, эксперымент атрымаўся. Мы спадзяёмся, што гэтая практыка працягнецца... Безумоўна, хацелася б зрабіць нешта такое і ў фармаце студэнцкага атрада, аднак для гэтага патрабуецца спонсарская падтрымка.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*
*Мінск — Рэчыцкі раён — Мінск.*



Фота Надзеі БУЖАН.

**Паляванне на артэфакты ў большасці школьнікаў выклікае захапленне.**

*Ажывіць даўніну*

# РЭКАНСТРУКЦЫЯ БЕЗ ПАЛІТЫКІ,

## або Як акунуцца ў мінулую эпоху

**У той час як маленькія дзяўчынкі гуляюць у прынцэс, хлапчукі майструюць цацачныя даспехі і ўяўляюць сябе рыцарамі. Але што, калі хлопчык пасталеў, а з даспехамі так і не развітаўся? Звон мячоў і сцягі на ветры хвалююць душу... Гульні вырастаюць разам з дзецьмі, правілы ўскладняюцца, драўляныя мячы ператвараюцца ў стальныя, фіранкі на плячах — у шыкоўныя плашчы... Заінтрыгаваны? Дазвольце вам распавесці пра дарослыя гульні ў рыцараў.**



У Беларусі існуе некалькі дзясяткаў клубаў гістарычнай рэканструкцыі. Штогод у месцах, якія славяцца сваёй гісторыяй, арганізуюцца фестывалі. У Мір, Навагрудак, Нясвіж, Ліду з'язджаюцца рэканструктары з усёй краіны і з-за яе межаў. На гэтых фэстах вы сустрэнеце і змрочных рыцараў, і гандляроў-рамеснікаў, і менестрэляў з варажбіткамі, і іншых прадстаўнікоў пэўнай эпохі.

— У клуб гістарычнай рэканструкцыі «Люцэрн» я патрапіла амаль выпадкова, — прыгадвае **першакурсніца Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі Лізавета БУЙКОВА**. — Хацела заняцца стральбой з лука, і мая знаёмая сказала, што лучнікі павінны быць у гэтым клубе. У рэшце рэшт высветлілася, што іх там няма, але мяне нават не прыйшлося ўгаворваць запісацца да іх на танцы, а далей — пайшло-паехала. Хацелася б прыгадаць добрым словам кіраўніцу нашай жаночай часткі калектыву Ірыну Міхайлаўну Салавей, якая ў свой час вельмі дапамагла мне асвоіцца.

«Люцэрн» існуе з 2012 года, але сам клуб быў створаны ў 1994 годзе. Чатыры гады таму змяніліся тэматыка і назва: з асвятлення падзей XIII стагоддзя перайшлі на XIV стагоддзе, «Ордэн храма» стаў «Люцэрнам» (назва паходзіць ад вобласці ў Швейцарыі).

— У клубе зараз больш дзяўчат. Ім, напэўна, у чымсьці прасцей: не трэба рабіць даспехі, якія каштуюць немалых грошай (але калі вельмі хочацца, то можна і зрабіць), і трэніроўкі па танцах не такія цяжкія, як баявыя для юнакоў, — лічыць Ліза. — Думаю, з-за гэтага хлопцаў не так шмат. Не кожны вытрымае такую дысцыпліну і такія нагрузкі, асабліва на пачатку, калі яшчэ не выпрацаваны неабходныя навыкі.

Прайшло тры з паловай гады з майго першага дня ў клубе. Магу з упэўненасцю сказаць, што з таго часу маё жыццё моцна змянілася. Спачатку бацькі хваляваліся, што маё захапленне адаб'ецца на вучобе. Але, па праўдзе кажучы, мая вучоба зусім не пацярпела. Проста час, які раней праводзіла за камп'ютарам, я цяпер прысвячаю любімаму занятку.

У нас год дзеліцца на некалькі сезонаў. Большую яго частку ўдзельнікі клуба шыюць, чыняць, дапаўняюць свае касцюмы, упрыгожванні, прадметы быту і рыхтуюцца да новага сезона фестываляў. Лета мы праводзім у раз'ездах па Беларусі і іншых краінах. Адзінае, што нас абмяжоўвае, — гэта рэсурсы. Звычайна ўсё ўпіраецца ў транспарт.

Самі фестывалі, як правіла, праходзяць па выхадных і доўжацца два-тры дні. Выезд падобны на гіганцкі сямейны пікнік, але «сваякоў», як кажа Лізавета, занадта шмат, каб усіх іх запомніць.

— Што мне больш за ўсё падабаецца ў рэканструкцыі? — задумалася мая суразмоўца. Магу вылучыць некалькі асноўных момантаў. Па-першае, у ёй няма палітыкі. Беларусы, палякі, украінцы, рускія — мы ўсе сябры. Па-другое, рэканструкцыя — гэта асобны маленькі свет, ён практычна раўназначны слову «культура». Быць рэканструктарам — значыць, быць швачкай, танцорам, артыстам, рамеснікам, любіць паходы, прыроду, жывёл, фаер-шоу, гульні, у якія гулялі стагоддзі таму, умець страляць з лука і, вядома ж, любіць турніры — пешыя і конныя. Трэба ўсведамляць і паважаць тое, што ты робіш, бо многім традыцыям, заняткам і ўсякім дробязям куды больш гадоў, чым ты думаў.

Размаўляючы з гэтай дзяўчынай, я бачыла шчырую захопленасць у яе вачах. Для мяне такія людзі, як яна, падобныя да чараўнікоў. Яны ўваскрашаюць — няхай толькі на час прадстаўлення — даўно мінулую эпоху, дапамагаюць адчуць дух таго часу — часу сапраўдных мужчын, адчайных учынкаў, подзвігаў і вытанчаных дам.

**Арына КАГАЛЁНАК,**
**студэнтка І курса**
**Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі.**

*Гісторыя пад нагамі*

# ШУКАЦЬ І ЗНАХОДЗІЦЬ

## Ці стануць гарадскія квэсты сур'ёзным бізнесам?

**Сёння неверагодную папулярнасць у моладзі і не толькі набіраюць квэсты. Магчыма, людзям надакучыла бавіць час ва ўжо звыклых кінатэатрах ды кавярнях, таму яны і шукаюць нязведанае.**
**Апроч іншых праводзяцца і не зусім звычайныя гульні — гарадскія квэсты. Яны для тых, хто любіць вуліцы горада так жа моцна, як і авантуры.**

### Гуляць і вучыцца

У сталіцы на такіх квэстах спецыялізуецца платформа Шукай.by. Паўтара года таму яна была створана прагамістам Яраславам Ліхачэўскім: «Мы з сяброўкай вырашылі, што нам надакучыла працаваць у карпарацыі, хацелі зрабіць турыстычны сэрвіс, але іх і так ужо было шмат, таму стварылі гэты праект».

Ідэя была рэалізавана вельмі хутка — праз два тыдні пасля задумы прайшоў і сам квэст, паўдзельнічаць у якім захацелі больш як 500 чалавек. Калі іншыя гульні маюць даволі шырокае кола тэм, то для Шукай.by галоўным з'яўляюцца культура і гісторыя Беларусі. Доказ гэтаму — і самы вядомы квэст платформы «12 апосталаў», які праводзіцца ў Нясвіжскім палацы і над якім, па словах Яраслава Ліхачэўскага, каманда працавала даўжэй за ўсё: «Задача ў Нясвіжы — пошук 12 залатых апосталаў. Каб іх знайсці, трэба пазнаёміцца з прывідамі князёў, якія ў той час жылі, і выканаць іх заданні. У нас там усе вядомыя асобы — і пане Каханку, і Рыбанька, і Марыя Дарота Радзівіл».

Акрамя нясвіжскага, Шукай.by ладзіць і іншыя квэсты. Напрыклад, па рамантычных легендах і паданнях Мінска, у музеі Петруся Броўкі, па мінскім метро. І нельга сказаць, што ўсё гэта — проста забава. «Я дакладна ведаю адно: дзеці навучаюцца ў гульні ўсяму на свеце, праз яе пазнаецца навакольны свет. Менавіта таму мы і выбралі такую форму для падачы гісторыка-культурных звестак», — кажа Яраслаў.

### Стварыць гульню сам

Увогуле, прыдумаць сюжэт не так і лёгка. Ствараючы квэст, Яраслаў з камандай шмат часу правялі ў архівах, працавалі з дакументамі, раіліся з музейнымі супрацоўнікамі, прапрацоўвалі гістарычную дакладнасць. А вось для гарадскіх гульняў не трэба амаль нічога, акрамя эрудыцыі і вольнага часу, таму каманда падтрымлівае ініцыятыву людзей, якія самі хочуць прыдумаць квэст, — заахвочвае іх, каб яны стварылі турыстычны праект самастойна. Напрыклад, квэст у музеі Петруся Броўкі зроблены яго супрацоўнікамі.



Князь Радзівіл дае парады па пошуку 12 апосталаў.

Пашпацыраваць па горадзе прыходзіць у асноўным моладзь, але Яраслаў хоча прыцягнуць болей падлеткаў: «Важна зацікавіць іх гісторыяй праз гульню».

Зараз у камандзе Шукай.by дзесяць чалавек, якія займаюцца распрацоўкай мабільных праграм, астатнія — прыдумваюць квэсты. Яраслаў з сябрамі працуюць над сур'ёзным сэрвісам для беларускіх музеяў і палацаў — інструментам, які зробіць экскурсіі больш цікавымі. Там будуць рэчы накшталт інтэрактыўных карт месца, як у камп'ютарнай гульні, музейны кантэнт, інфармацыя пра экспазіцыю і гісторыю, аўдыёгід.

### Усе любяць каханне

У Беларусі шмат цікавых месцаў, а тэм — яшчэ больш, лічыць Яраслаў Ліхачэўскі. «Усё гэта трэба расказваць і паказваць людзям. Якая б вялікая ў нас каманда ні была, жыцця на гэта не хопіць, таму задача ў захоўванні іншых».

Да канкурэнтаў-квэструмаў у Шукай.by ставяцца спакойна. «Мы дапамагаем адзін аднаму. Ускосна спабарнічаем нават з кінатэатрамі, бо людзі выбіраюць: паглядзець фільм ці пагуляць па горадзе. Але ўсе мы робім прынцыпова розныя прадукты. Зараз квэструмы — трэндавая рэч, праз іх даведваюцца і пра нас. Людзі згулялі квэст у пакоі, а пасля хочуць авантурных прыгод у горадзе».

Самая папулярная гульня Шукай.by у Мінску — пра каханне, бо «усе ж любяць каханне». «Мы хацелі пазнаёміць людзей з гарадскімі легендамі, — расказвае Яраслаў, — але іх трэба было неяк звязаць у адзіны аповед. Таму мы знайшлі персанажа — гарадскога цмока, які быццам скраў прыгажуню, а нам трэба яе вызваліць».

### Які пароль ад Wi-Fi?

Квэсты — выдатная рэч для знаёмства з гісторыяй. Прыклад — музей Петруся Броўкі. У яго часта водзяць школьнікаў, якім там бывае сумна, бо дзеці слухаюць сухія факты з біяграфіі пісьменніка. А зараз там з'явіўся квэст, ён вельмі просты, але цікавы і карысны. Напрыклад, пароль ад музейнага Wi-Fi — дзень нараджэння Петруся Броўкі. Гэтую інфармацыю вельмі лёгка можна знайсці ў экспазіцыі. А тут дзеці яшчэ і спаборнічаюць — хто даведаецца хутчэй, той хутчэй пройдзе гульню. Дарослых зацікавіць так жа лёгка. «Мы гэта яшчэ ў Нясвіжы пабачылі. Яны гуляюць не менш ахвотна, чым дзеці».

Праект Шукай.by без перабольшвання можа стаць для Мінска яшчэ адной турыстычнай «разыначкай» — з яго дапамогай госці даведаюцца пра гісторыю і сталіцы, і нашай краіны. Яраслаў Ліхачэўскі кажа, што хацеў бы, каб квэсты былі накіраваныя не толькі на ўнутранага турыста, але і на замежнага: «Штогод праз Нясвіжскі комплекс праходзіць 400 тысяч чалавек. Гэта дастаткова сур'ёзны бізнес. У Нясвіжы ўсё робіцца па-еўрапейску, іншым турыстычным месцам трэба на яго раўняцца».

### Да Версаля — адзін крок

Яраслаў лічыць, што ў нашай краіне магчыма стварыць вялікі турыстычны трафік.

Але пакуль каманда Шукай.by збіраецца працаваць у Еўропе, рабіць праекты для іх музеяў. А пасля яны абавязкова перанясуць усё прыдуманае ў Беларусь. «Дапаможам нашай спадчыне адрадзіцца, — абяцае Яраслаў і дадае, што няма сэнсу пачынаць з маленькага. — У Еўропе мы будзем ладзіць квэсты ў Версалі і Таўэры. Калі можаш зрабіць вялікае — рабі. Таму ў Мінску мы пачалі з Нясвіжа».

Адна з нерэалізаваных задум Шукай.by — веласіпедная гульня ў Налібоцкай пушчы — пакуль іх самая грандыёзная ідэя. Падчас Вялікай Айчыннай вайны ў пушчы баяліся заходзіць немцы — гэта была тэрыторыя партызан. Там засталіся рэшткі сядзібы Тышкевіча, таксама гэтыя мясціны звязаныя з імем Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Нікога не пакіне раўнадушным чароўная прырода пушчы. Яраслаў кажа, што яны ўжо нават склалі маршрут: «Але, калі праклалі дарогу, высветлілася, што там няма моста праз рачулку. Мы падлічылі, што можам аднавіць яго самі. Будзем збіраць грошы». Спадзяюся, у іх усё атрымаецца.



На шляху да таямніцы.

**Маргарыта ДЗЯХЦЯР.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовская швейная фабрика» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже:**

**Лот № 1. Здание блока вспомогательных цехов**, общ. пл. **1248,9 кв.м**, инв. № 610/С-57699, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100001002730 площадью 0,3053 га по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Рубена Ибаррури, 9/8.

**Начальная цена с НДС (20%) – 243 656,40 бел. руб. (в денежных единицах 2000 года – 2 436 564 000 бел. руб.). Задаток 10% (24 365,64 бел. руб.).**

**Лот № 2. Здание компрессорной, общ. пл. 104,3 кв.м, инв. № 610/С-56786,** распложенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100001002729 площадью 0,1300 га по адресу: Минская область, г. Борисов, ул. Рубена Ибаррури, 9/7.

**Начальная цена с НДС (20%) – 26 296,80 бел. руб. (в денежных единицах 2000 года – 262 968 000 бел. руб.). Задаток 10% (2 629,68 бел. руб.).**

Аукцион по лотам №№ 1, 2 состоится **19.09.2016 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **16.09.2016 до 16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

**Лот № 3 (повторный аукцион).** Изолированное помещение (**помещение буфета**), общ. пл. 307,8 кв.м, инв. № 610/D-60738 в г. Борисов, ул. Рубена Ибаррури, 9/1-2.

**Начальная цена с НДС – 20 760,58 бел. руб. (в денежных единицах 2000 года – 207 605 760 бел. руб.). (*Стоимость снижена на 80%*). Задаток 10% (2 076,06 бел. руб.).**

**Лот № 4 (повторный аукцион).** Изолированное помещения (**помещение столовой**), общ. пл. 517,2 кв.м, инв. № 610/D-60737, оборудование (с перечнем можно ознакомиться у организатора торгов) и малоценные быстро снашивающиеся предметы (с перечнем можно ознакомиться у организатора торгов), расположенное в г. Борисов, ул. Рубена Ибаррури, 9/1.

**Начальная цена с НДС – 33 136,32 бел. руб. (в денежных единицах 2000 года – 331 363 200 бел. руб.). (*Стоимость снижена на 75%*). Задаток 10% (3 313,63 бел. руб.).**

**Лот № 5 (повторный аукцион). Здание котельной,** общ. пл. 1088,3 кв.м, инв. № 610/С-14497, оборудование (с перечнем можно ознакомиться у организатора торгов) и малоценные быстро снашивающиеся предметы (с перечнем можно ознакомиться у организатора торгов), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 620850100001000349 **пл. 0,1261 га** по адресу: **г. Борисов, ул. Рубена Ибаррури, 9**.

**Начальная цена с НДС – 33 886,20 бел. руб. (в денежных единицах 2000 года – 338 862 000 бел. руб.). *(Стоимость снижена на 80%).* Задаток 10% (3 388,62 бел. руб.).**

**Лот № 6 (повторный аукцион). Производственный цех,** общ. пл. 1462,1 кв.м, инв. № 610/С-61785, по адресу: **г. Борисов, ул. Рубена Ибаррури, 9/2-3.**

**Начальная цена с НДС – 109 677,98 бел. руб. (в денежных единицах 2000 года – 1 096 679 800 бел. руб.). *(Стоимость снижена на 60%).* Задаток 10% (10 967,80 бел. руб.).**

**Задатки в размере 10% от начальной цены предмета аукциона перечисляются на р/с № 3012108260016 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Аукцион по лотам №№ 1, 2 состоится **29.08.2016 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **26.08.2016 до 16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

Предыдущее извещение по лотам №№ 3–6 опубликовано в газете «Звязда» от 22.07.2016.

Порядок проведения аукциона регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 15 (пятнадцать) банковских дней после подписания договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

## Острошицкий сельский исполнительный комитет (организатор аукциона) извещает о проведении 26 сентября 2016 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь (га) | Ограничения в использовании, инфраструктура | Начальная цена (бел. рублей) | Размер задатка (бел. рублей) | Расходы по изготовлению документации (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | аг. Острошицы, ул. Зелёная, 6, кадастровый номер 623286306601000431 | 0,1500 | Район индивидуальной застройки «Острошицы» – имеется электричество, вода, дороги в стадии строительства, возможность подключения газа | 5 650,00 | 565,00 | 207,30 |
| 2 | аг. Острошицы, ул. Зелёная, 8, кадастровый номер 623286306601000429 | 0,1500 | Район индивидуальной застройки «Острошицы» – имеется электричество, вода, дороги в стадии строительства, возможность подключения газа | 5 650,00 | 565,00 | 207,30 |
| 3 | д. Чуденичи, ул. Садовая, 11, кадастровый номер 623286308101000449 | 0,1206 | Новый район индивидуальной застройки. Сети в стадии проектирования | 3 860,00 | 386,00 | 1 484,44 |
| 4 | д. Чуденичи, ул. Западная, 3, кадастровый номер 623286308101000451 | 0,1199 | Новый район индивидуальной застройки. Сети в стадии проектирования | 3 860,00 | 386,00 | 1 484,44 |

Дата, время и место проведения аукциона: **26 сентября 2016 года в 10.00** по адресу: Логойский район, аг. Острошицы, ул. Центральная, д. 8, Острошицкий сельский исполнительный комитет.

Прием документов: ежедневно с 8.00 до 17.00 (кроме субботы и воскресенья) **по 20.09.2016 г. включительно**; к заявлению прилагаются квитанция об оплате задатка и копия личного паспорта.

Задаток перечисляется на расчетный счет 3600619141105 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 153001795, УНН 600537220, код платежа 04901, получатель Острошицкий сельский исполнительный комитет.

Условия: победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.

Конт. тел.: (801774) 57 6 21, 57 6 35, 57 6 36; (+37529) 6444886.

## БЕЛАРУЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
### сообщает о проведении 19 сентября 2016 года открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность для строительства одноквартирного жилого дома

| Номер лота | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена, бел. руб. | Расходы по подготовке зем. документации | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Аукцион по продаже земельных участков гражданам в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома** | | | | | | |
| 1 | Минская область, Логойский район, Беларучский с/с, д. Корбачевка, земельный участок У-11, кадастровый номер 623280403601000073, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1354 | Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги | 7 200 | *1 489,75 + публикация в газете* | 720 |
| 2 | Минская область, Логойский район, Беларучский с/с, д. Мочаны, ул. Тихая, земельный участок №4, кадастровый номер 623280406101000420, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1291 | Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги | 9 300 | *1 565,86 + публикация в газете* | 930 |
| 3 | Минская область, Логойский район, Беларучский с/с, д. Корбачевка, земельный участок У-12, кадастровый номер 623280403601000074, целевое назначение земельного участка – земельный участок для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,1354 | Возможность подключения к электроснабжению, подъезд с грунтовой дороги | 7 200 | *1 501,99 + публикация в газете* | 720 |

*Задаток (10% от начальной цены) перечисляется на расчетный счет № 3600619011121 в ОАО «АСБ Беларусбанк» код банка 795, код платежа 4901, УНН 600181549 получатель – Беларучский сельский исполнительный комитет.*

**Аукцион состоится 19 сентября 2016 года в 10.00 по адресу: Минская обл., Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17.**

Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00 по адресу: Минская обл., Логойский район, д. Алекшицы, ул. Центральная, д. 17.

Последний день приема заявлений – **13 сентября 2016 года до 17.00**.

Контактные телефоны: (801774)58445, 58435, 58436.

## И З В Е Щ Е Н И Е о проведении повторного открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, находящегося в собственности ОАО «Строительный трест № 17 ордена Трудового Красного Знамени», 30 августа 2016 года

| № лота | Предмет аукциона (наименование объекта, его местонахождение, площадь) | Начальная цена продажи предмета аукциона, бел. руб. (без учета НДС) с/без учета деноминации | Размер задатка, бел. руб. с/без учета деноминации | Характеристика объекта | Условие аукциона |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 700/С-48639 (здание битумохранилища БАБЗ), общей площадью 1 205,7 кв.м, расположенное по адресу: Могилевская область, Могилевский район, Кадинский с/с, 15 | 50 535 р./ 505 350 000 | 2 526 р. 75к./ 25 267 500 | Одноэтажное каменное здание битумохранилища с двумя пристройками. Фундамент – бетонный; стены – из железобетонных панелей, кирпичные; перекрытия – железобетонные; крыша – рулонная совмещенная; полы – бетонные | Без условий |

**Начальная цена снижена на 50 %.**

**Аукцион состоится 30 августа 2016 года в 15.00 в зале заседаний Могилевского городского исполнительного комитета по адресу:** г. Могилев, ул. Первомайская, 28а.

**Заявки принимаются ежедневно с –** 19 августа 2016 года в рабочие дни с 8 до 17 часов (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00) по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 28а, каб. 407.

**Последний день приема заявлений и внесения задатка –** 26 августа 2016 года до 17.00 часов. Заявления, поступившие после указанного срока, не рассматриваются.

**Заключительная регистрация участников аукциона** 30 августа 2016 года с 14.00 до 15.00 часов.

Продавец: ОАО «Строительный трест № 17 ордена Трудового Красного Знамени», 212002, г. Могилев, б-р Непокоренных, 28, тел.: (80222) 48-42-83, 48-35-75, 48-82-68, 48-45-48.

Организатор аукциона – МГ УКП «Центр по приватизации», 212030, г. Могилев, ул. Первомайская,28а, контактные телефоны: (80222) 22-21-78, 22-00-89.

Площадь земельного участка с кадастровым номером 724400000001000840 площадью 0,5078 га для содержания и обслуживания битумохранилища.

Аукцион проводится в соответствии с порядком проведения открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Строительный трест № 17 ордена Трудового Красного Знамени».

Лица, желающие принять участие в аукционе, не позднее срока, указанного в извещении о проведении аукциона подают заявление на участие в аукционе, подписанное с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон, заявление об ознакомлении с объектом, к которым прилагаются:

- **документ, подтверждающий внесение суммы задатка** на расчетный банковский счет организатора аукциона - МГ УКП «Центр по приватизации» 3012430089016 Дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Могилевской области, МФО 153001739, УНН 700008710 с отметкой банка;

- ***юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь –*** копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

- ***иностранным юридическим лицом –*** легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее 6 месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

- ***иностранным индивидуальным предпринимателем –*** легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык;

- ***представителем юридического лица Республики Беларусь –*** доверенность, выданная в установленным законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель);

- ***представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь –*** нотариально удостоверенная доверенность:

- ***представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя –*** доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление на участие в аукционе с приложением всех необходимых документов, внесшие в установленном порядке на указанный в извещении расчетный банковский счет сумму задатка, заключившие с организатором аукциона соглашение, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе и получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления.

Организатор аукциона имеет право отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты проведения аукциона. Объявление об отказе от проведения аукциона публикуется в том же печатном издании, в котором публиковалось извещение. Кроме того, организатор аукциона должен проинформировать участников, подавших заявление на участие в аукционе, об отказе от проведения аукциона.

Перед началом аукциона их участники обязаны зарегистрироваться у организатора аукциона и обменять билеты участников на аукционные номера, которые возвращаются организатору аукциона после их окончания.

Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе аукциона наивысшую цену.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов (далее – единственный участник аукциона).

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан в установленном порядке возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение.

После предъявления копии платежных документов о перечислении суммы затрат на организацию и проведение аукциона в установленном порядке, в соответствии с подписанным в день проведения аукциона соответствующим протоколом, между продавцом предмета аукциона и победителем аукциона (единственным участником аукциона) заключается договор купли-продажи предмета аукциона.

Договор купли-продажи заключается продавцом и победителем аукциона (единственным участником аукциона) в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола о результатах аукциона.

Оплата стоимости приобретенного на аукционе предмета аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником аукциона) в белорусских рублях в установленном порядке.

Условия оплаты – по согласованию с продавцом возможно предоставление рассрочки платежа до 6 месяцев.

С объектом можно ознакомиться ежедневно в рабочие дни недели с 8 до 17 часов, предварительно согласовав время с продавцом.

В предусмотренных законодательством случаях уплачивается штраф организатору аукциона в течение одного месяца в размере 10 000 (Десять тысяч) белорусских рублей: **победителем аукциона –** в случае, если он в установленный срок не подписал протокол о результатах аукциона, не возместил организатору аукциона сумму затрат на организацию и проведение аукциона, не подписал договор купли-продажи предмета аукциона; **лицом, приравненным к победителю аукциона –** в случае его отказа (уклонения) от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона и (или) подписания договора купли-продажи предмета аукциона; **участниками аукциона –** в случае их отказа объявить свою цену за предмет аукциона, в результате чего аукцион признан нерезультативным.

**Контактные телефоны организатора аукциона для уточнения и получения дополнительной информации: г. Могилев (0222) 22-21-78, 22-00-89.**

*Друкуецца ў «Маладосці»*

# Смерць прыходзіць без запрашэння

**Святлана Галуза нарадзілася ў Оршы, ёй дзевятнаццаць. Вучыцца ў Інстытуце журналістыкі БДУ. Раней займалася каратэ і танцамі, а цяпер удзельнічае ў паўмарафонах і забегах. Валанцёр «Эгіды» і Цэнтра дзіцячай анкалогіі. У вольны час любіць чытаць, складаць розныя гісторыі і слухаць цяжкую музыку.**



Антон прачнуўся ад званка ў дзверы. Нягледзячы на тое, што за вокнамі было цёмна, а гадзіннік упарта паказваў чатыры раніцы, нехта, відаць, да зарэзу жадаў яго бачыць.

— Ат, каб цябе... — злосна прамовіў ён і падняўся з ложка. Холад кватэры, у якой дні тры таму адключылі ацяпленне, непрыемна ахутаў цела і прымусіў скуру пакрыцца дрыжыкамі. Антон лянотна сунуў ногі ў тапкі і, уздыхаючы, пайшоў да дзвярэй.

— Хто б ты ні быў, я цябе заб'ю! — сказаў ён, адчыняючы. І... абамлеў.

Насупраць стаяла даўганогая бландзінка ў ружовым паліто да сярэдзіны сцягна і ў ботах на вялізных абцасах. Яна была вельмі падобная да тых дзяўчат, якія часам трапляліся Антону ў крамах, метро, нават у рэдакцыі, дзе ён працаваў. Яны пагардліва аглядалі яго старое паліто і акуляры з паламанай дужкай, штурхалі яго ў плячо, маўляў, не стой на дарозе, і ішлі далей, а ён, задумненны і сарамлівы, моўчкі глядзеў ім услед, здаецца, нічога не разумеючы.

— Вы хто? — утаропіўшы вочы ў дзяўчыну, спытаў ён.

— Салю-ю-юцік! — яна занадта салодка ўсміхнулася і дастала з кішэні свайго паліто iPhone апошняй мадэлі ў ружовым чахле. — Мяне завуць Дэйзі. Я Смерць, прыйшла, каб забраць цябе.

Пануеш дзяўчыне кавы ці гарбаты? Мне, калі што, экспрэса.

— Эспрэса, — механічна паправіў мужчына і выйшаў на кухню, не разумеючы, што ўвогуле адбываецца.

Пакуль ён гатаваў каву, Дэйзі крычала яму з пакоя:

— А наша фотка яшчэ Бісмарку спадабалася! І Сталіну таксама! О, і Мусаліні, і Гітлеру! Зараз прачытаю, што ён напісаў. Іхь... Ліе... Слухай, ты па-нямецку разумееш? А то гэты казёл іншых моў не ведае!

Ён моўчкі пайшоў у суседні пакой і ўзяў тэлефон.

— Толькі акуратна, не лапай. Я нядаўна экран замяніла, столькі баблосаў адваліла за гэта!

Антон праігнараваў словы Дэйзі.

— Гітлер піша, што мне няма чаго рабіць на зямлі і што жыві я ў яго час, ён бы мяне забіў.

— Ну, вось бачыш! Ды ты не трымціся так, у пекле табе будзе добра! Бісмарк класны пацан, я цябе побач з ім пасялю. А насупраць жыве Чыкаціла. Ты з ім акуратна, добра? Ён увогуле добры дзядзька, але калі што... Ды я ў яго ўсё роўна штовечар бываю, буду заходзіць да цябе. Мы з Андрэйкам сустракаемся ўжо дзесяць гадоў, да-а!

— Ты-ы-ы? — Антон здзівіўся яшчэ больш і ледзь не ўпаў на падлогу, у апошні момант схапіўшыся за дзверы.

— Ага, — пагадзілася яна. — Давай сэлфі зробім.

— Што? — не зразумеў мужчына.

— Сэлфі! — яна, здаецца, пачала абурацца. — Чаго тут незразумелага? Ну, хадзі сюды! — дзяўчына абняла яго і, склаўшы вусны, быццам для пацалунку, зрабіла фотаздымак.

— Во, бачыш, гэта не страшна! Зараз толькі ў Інстаграм кіну. Можа, прапусціш дзяўчыну? А то тут халодна!

Антон стаяў як скамянелы і проста не ведаў, што думаць і рабіць. А Дэйзі і не заўважала гэтага. Адштурхнуўшы мужчыну, яна ўвайшла ў непрыбраную кватэру і накіравалася ў адзіны пакой.

— Да-а-а... Ну і гармідар тут у цябе! — канстатавала яна, агледзеўшы памяшканне. Антон моўчкі прайшоў за ёю, адчуваючы, як страх адыходзіць і вяртаецца розум.

— Што табе тут патрэбна? Чаму ты прыйшла?

— Дзіўны ты! — Дэйзі какетліва адкінула валасы назад. — Не ведаеш, чаму смерць прыходзіць, ці як?

— Не, ну... Ведаю... Яна прыходзіць, калі чалавеку ўжо час на той свет.

— Вось... А твой час надышоў зараз! О! — яна зноў дастала тэлефон. — Люцыфер лайк на фотку паставіў. Глядзі, што напісаў: «Зачотны чувак! Дзе адхапіла?» О, яшчэ і Таркведама камент пакінуў! — яна ненатуральна рассмяялася. — Хоча, каб ты з ім у футбол згуляў. Галовамі. Умееш?

Антон аслупянеў. Гэта не жарт? Гэта не сон? Няўжо ўсё адбываецца на самай справе? А што цяпер рабіць?

— Пачакай. Гэта... Ты што, праўда, Смерць?

— Ну, ты глухі ці як? — абурана працягнула дзяўчына. — Мала таго, што недарэка і небарака, дык яшчэ і вушы не чысціш. Фу такім быць!

— Навошта ты прыйшла? Мне ўсяго сорак восем!

— Усяго... — перадражніла яна. — Нам там без розніцы, сорак восем табе ці восем. Прыйдзем — і ўсё! Ды што табе губляць? Грошай няма, жонкі няма, дзяцей няма, нават палюбоўніцы — і той няма! Жывеш тут як наводшыбе, марнуеш жыццё, нават пра сэлфі і «УКантакце» не ведаеш!

— Ну, чаму... Ведаю.

— Да ладна-а-а? — недаверліва працягнула Дэйзі і ўтаропіла вочы ў Антона. — І што ж ты ведаеш?

— Ну... «УКантакце» — гэта як «Аднакласнікі», толькі там больш моладзі сядзіць.

Яна рассмяялася, а Антон ад гэтага збянтэжыўся і ўтаропіў вочы ў падлогу.

— І ўсё? — спытала яна, выціраючы слёзы. — Да-а... Папавал, так сказаць. Слухай, можа, пра-

Антон усё больш здзіўляўся кожнаму слову. Калі б у яго засталіся хаця б рэшткі розуму, ён першнаперш выгнаў бы дзяўчыну за дзверы, але ён быў занадта разгублены. Голас Дэйзі гіпнатычна дзейнічаў на яго, і ён моўчкі рабіў усё, што яна патрабавала.

— Табе са мной нецікава? — раптам спытала яна, і яе вусны скрывіліся і задрыжалі. — Ты ў мяне нават не пытаеш нічога!

— А што пытаць?

— Ну... Не ведаю... Хоць што! Як быццам табе напляваць, што я тут... Цяпер зразумела, чаму ў цябе жонкі няма...

А і праўда! Антон нават не заўважаў, што раней у размовах з жанчынамі паглыбляўся ў сябе і нічога не чуў і не бачыў.

— У мяне зараз толькі адно пытанне: чаму ты тут?

— Як чаму! — яна пераможна хіхікнула: нарэшце атрымалася разбудзіць мужчыну. — Час надышоў! Табе няма чаго рабіць тут. Усё жыццё ты спусціў дарма. Жыццё, што было табе дадзена, я адабрала і падарыла маленькаму хлопчыку з лейкозам. Няхай ён пажыве замест цябе.

— Што за хлопчык? — вырвалася ў яго.

— Стадзелаў Антон, пяць гадоў. Ён з дзіцячага дома. У яго лейкоз і жыць яму засталося, мабыць, месяцы тры-чатыры. А тваё гады, якія табе ўсё роўна не патрэбныя, застануцца яму.

У Антоне змагаліся дзве супярэчнасці. З аднаго боку, сваёй смерцю ён падорыць гады жыцця маленькаму хлопчыку, з другога... Можа, не трэба? Малеча ўсё роўна нічога добрага ў дзіцячым доме не бачыць... Няхай цяпер пампрэ, чым потым ад наркотыкаў ці алкаголю.

«Божа, пра што я думаю!»

— Можна мне трохі часу, каб даць адказ? — слабым голасам папрасіў Антон.

— А я не прашу адказу, я стаўлю цябе перад фактам.

— Калі ласка... — ён ледзь не маліў. — Я не хачу паміраць!

— А ніхто не хоча! — Дэйзі стала вельмі сур'ёзнай. — Так што збірайся. А хаця... Ладна! Як памерці хочаш? Толькі каб прыгожанька было, бо я ў Instagram выкладу. І на Facebook напішу.

Антон пачаў разважаць. Цікава: чалавек разважае над спосабам уласнай смерці! Каму сказаць — не павераць! Але ж...

— Можа, у мяне яшчэ ёсць шанс? — з надзеяй спытаў ён. На сэрцы было балюча ад таго, што ранкам ён не пойдзе на працу, не аддасць загады падначаленым, як было заўсёды, не вызначыць кантэнт наступнага нумара часопіса, не падпіша ніводнай справаздачы...

— Ну, ты тупы, ці як? — дзяўчына зноў раззлавалася, не па-добраму зыркнуўшы ў яго бок маленькімі вочкамі. — Колькі разоў яшчэ сказаць трэба, каб ты зразумеў? Індык! Кажы хутчэй, як памерці хочаш, мне яшчэ за дзедам Мацеем у суседні пад'езд ісці!

І тут у Антоне нешта заварушылася. Раптам ён адчуў такую прагу жыцця, такое жаданне ўбачыць світанак, ранішняе метро, будынак рэдакцыі, што схапіў Дэйзі за каўнер ружовага паліто і адным махам узняў.

— Ты гэта вось што... Мне пляваць, хто ты і што ты, мне пляваць на ўсё, што ты тут мне казала! Я не збіраюся слухаць цябе, я ўжо ўсё зразумеў! Правальвай адсюль і не з'яўляйся ў бліжэйшыя гадоў трыццаць!

Быццам кацяня, ён вынес яе з кватэры і выкінуў на лесвіцу, не зважаючы на крыкі і пратэсты. Кіпцюрамі, пакрытымі ружовым лакам, яна драпала яго рукі, шыю, але ён быў мацнейшы. Жорсткасць (хаця ён ніколі не быў жорсткім) запоўніла кожную клетку яго цела. І да яе прымешвалася прага жыцця.

З пад'езда данесліся грукат і звон разбітага шкла. Пэўна, Дэйзі, падаючы, згубіла свой iPhone з Instagram і каментарыямі ад Гітлера, Бісмарка і іншых.

***

Антон са страхам падскочыў на ложку і агледзеўся. Ніякіх слядоў прысутнасці Дэйзі. «Фу, дзякаваць Богу, сон!» — з палёгкай падумаў ён і глыбока ўдыхнуў. Марознае паветра з незачыненай форткі запоўніла лёгкія. «Як жа гэта добра — жыць!» — падумаў ён і стаў збірацца на працу.

Ён выйшаў з дому ў добрым настроі, яго нават не пужала неабходнасць ехаць у рэдакцыю на метро і зноў лавіць пагардлівыя позіркі маладых дзяўчат, падобных да Дэйзі. Больш за ўсё хацелася ў офіс, туды, дзе яго, несумненна, чакаюць падначаленыя.

У двары ён сустрэў Валянціну, касірку з бліжэйшага супермаркета, якая жыла ў суседнім пад'ездзе.

— Прывітанне, Валя! — усміхнуўся ён, памахаўшы ёй рукой.

— Добрай раніцы, Антось!

Звычайна вясёлая і прыгожая, сёння жанчына выглядзела стомленай і засмучанай, і гэта насцярожыла Антона.

— Валя, што здарылася?

— Ты не ведаеш яшчэ? Дзед Мацей памёр.

І зноў гэтае адчуванне, як у сне — пачуццё страху, змешанага з нечаканасцю...

— Як памёр?

— Інфаркт, кажуць. Эх, шкада, добры чалавек быў!

«Няўжо мой сон быў праўдай? — думаў Антон, баючыся зрабіць крок. — Але... У маёй кватэры няма нічога, што паказвала б на тое, што Дэйзі прыходзіла да мяне...»

Азіраючыся, быццам у пошуках Дэйзі, ён бег да метро, нават забыўшыся развітацца з суседкай. Страх надаваў яму моц, нягледзячы на недахоп дыхання. Ледзь паспеўшы, ён ускочыў у апошні вагон адыходзячага цягніка метро і... І аслупянеў.

Перад ім сядзела яна. Такая самая, як і ў сне. Доўгія белыя валасы, маленькія вочкі, ружовае паліто да сярэдзіны сцягна, iPhone у руках (з адкрытым профілем Instagram), вострыя ружовыя пазногці. Яна паглядзела на яго так, што душа схавалася ў раёне ахілава сухажылля, і раптам ты яна самым голасам прамовіла.

— Ну, прывітанне, прыгожанькі!..

Святлана ГАЛУЗА

*Голас з мінулага*

# Усё чакае маці сыноў...

**...Калі едзеш па дарозе да вёскі Трэмля, раптоўна позірку адкрываецца фігура жанчыны ў густым хвойніку. Ціха шапочуць дрэвы над магілай абаронцаў. Спяць салдаты вялікай вайны, абараняе іх спакой маці...**

У 1988 годзе на месцы колішняга жорсткага бою быў устаноўлены помнік над брацкай магілай. Сюды былі перазахаваны і байцы, якія загінулі ля вёскі Слабада і хутароў Перавееўскі і Перавессе. Помнік «Журботная маці» стаіць у лесе каля дарогі паміж вёскамі Першая Слабодка і Гарадзішча. Ён уяўляе сабою фігуру жанчыны, якая застыла ў чаканні. Постаць у доўгай спадніцы і кофце. Правая рука сагнутая і падтрымлівае левую. На галаве хустка...

Вось якое паданне пра гэты помнік распавёў ветэран Вялікай Айчыннай вайны Сцяпан Сяргеевіч Коўгар, жыхар вёскі Першая Слабодка.

| **Наименование (описание), местонахождение и стоимость имущества** | **Лот № 1.**<br>Забор железобетонный (40 пролетов по 3 секции, 45 столбов), местонахождение: Витебская область, Витебский район, д. Копти, с/т «Ручеек», ул. 4-я Линия, уч. 156.<br>Начальная стоимость лота 980,00 рублей<br>**Лот № 2.**<br>Вагончик строительный, местонахождение: Витебская область, Витебский район, д. Копти, с/т «Ручеек», ул. 4-я Линия, уч. 156.<br>Начальная стоимость лота 320,00 рублей<br>**Лот № 3.**<br>Строительный материал (деревянные рейки, 2 стопки, 5 кубов), местонахождение: Витебская область, Витебский район, д. Копти, с/т «Ручеек», ул. 4-я Линия, уч. 156.<br>Начальная стоимость лота 160,00 рублей<br>**Лот № 4.**<br>Холодильник («Минск» 15м»), местонахождение: Витебская область, Витебский район, д. Копти, с/т «Ручеек», ул. 4-я Линия, уч. 156.<br>Начальная стоимость лота 28,00 рублей<br>**Лот № 5.**<br>Электропила («Интерскол», в нерабочем состоянии), местонахождение: Витебская область, Витебский район, д. Копти, с/т «Ручеек», ул. 4-я Линия, уч. 156.<br>Начальная стоимость лота 20,00 рублей<br>**Лот № 6.**<br>Масляный радиатор («Термия», электрический), местонахождение: Витебская область, Витебский район, д. Копти, с/т «Ручеек», ул. 4-я Линия, уч. 156.<br>Начальная стоимость лота 16,00 рублей<br>**Лот № 7.**<br>Блоки из ячеистого бетона (80 штук), местонахождение: Витебская область, Витебский район, д. Копти, с/т «Ручеек», ул. 4-я Линия, уч. 156.<br>Начальная стоимость лота 44,00 рубля<br>**Лот № 8.**<br>Газовая плита (г. Брест, 4-камфорная), местонахождение: Витебская область, Витебский район, д. Копти, с/т «Ручеек», ул. 4-я Линия, уч.156.<br>Начальная стоимость лота 12,00 рублей<br>**Лот № 9.**<br>Фигуры садовые (бетонные, 5 штук), местонахождение: Витебская область, Витебский район, д. Копти, с/т «Ручеек», ул. 4-я Линия, уч.156.<br>Начальная стоимость лота 120,00 рублей |
| **Собственник (владелец) имущества** | Ермашкевич Вячеслав Анатольевич<br>(г. Витебск, ул. П. Бровки, 19-2-41) |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Витебская область, Витебский район,<br>д. Копти, с/т «Ручеек», ул. 4-я Линия, уч. 156 |
| **Наличие обременений** | Отсутствуют |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | Отдел принудительного исполнения Витебского района<br>г. Витебск, ул. Комсомольская, д. 31 каб. 14<br>31 августа 2016 года в 10.00 |
| **Справочная информация** | Организатор торгов: ГУЮ Витоблисполкома<br>210015, г. Витебск,<br>ул. Б. Хмельницкого, д. 10, к. 1<br>www.vitebskjust.gov.by,<br>Судебный исполнитель<br>Клименко Дмитрий Петрович<br>тел. (80212) 23-64-15, 375 33 399-78-08 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Витебского района г. Витебска: филиал №200 АСБ «Беларусбанк», код банка 150801635, р/с 3642903002661, УНП 300002505 не позднее 29.08.2016 года.<br>Минимальная величина первого шага – 5% стоимости каждого лота.<br>В соответствии с частью 6 статьи 516 Гражданского процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. |

Белинвестбанк

## К СВЕДЕНИЮ ВКЛАДЧИКОВ!

С **19 сентября 2016 года** Банк в одностороннем порядке уменьшает размер процентной ставки по договорам срочного банковского вклада (депозита) в белорусских рублях, заключенным в срок до 17 августа 2016 года, и устанавливает следующий размер процентных ставок:

% годовых

| «Срочный банковский вклад (депозит) «Пенсионный» | Срок вклада (депозита) |
|---|---|
| | 2 года |
| | 20,0% |

| «Срочный отзывный банковский вклад (депозит) «Пенсионный» | Срок вклада (депозита) |
|---|---|
| | 2 года |
| | 16,5% |

| «Срочный безотзывный банковский вклад (депозит) «Пенсионный», заключенный до 01.08.2016 | Срок вклада (депозита) |
|---|---|
| | 1 год |
| | 22,0% |

| «Срочный банковский вклад (депозит) «Универсальный» | Срок вклада (депозита) |
|---|---|
| | 2 года |
| | 16,0% |

| «Срочный банковский вклад (депозит) «Особый» | Срок вклада (депозита) |
|---|---|
| | 18 мес. |
| | 16,0% |

| «Срочный банковский вклад (депозит)» | Срок вклада (депозита) | | |
|---|---|---|---|
| | 12 мес. | 36 мес. | 60 мес. |
| | 16,0% | 17,0% | 19,0% |

| «Срочный безотзывный банковский вклад (депозит)», заключенный до 01.08.2016 | Срок вклада (депозита) | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | 6 мес. | 9 мес. | 12 мес. | 24 мес. | 36 мес. |
| | 18,0% | 19,0% | 20,0% | 21,0% | 22,0% |

| «Срочный банковский вклад (депозит) с правом востребования» | Срок вклада (депозита), по истечении которого допускается снятие всей суммы без потери процентов, и размер процентной ставки в зависимости от указанного срока | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 3 мес. | 6 мес. | 12 мес. | 36 мес. |
| | 15,0% | 15,5% | 16,0% | 16,5% |

| «Срочный отзывный банковский вклад (депозит) с правом востребования» | Срок вклада (депозита), по истечении которого допускается снятие всей суммы без потери процентов, и размер процентной ставки в зависимости от указанного срока | | | |
|---|---|---|---|---|
| | 3 мес. | 6 мес. | 12 мес. | 36 мес. |
| | 15,0% | 15,5% | 16,0% | 16,5% |

| «Срочный банковский вклад (депозит) «Личный выбор» | | | Срок вклада (депозита) | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 год | 2 года | 3 года |
| Условия частичного снятия денежных средств | % частичного снятия | % остатка средств во вкладе (депозите) | Процентная ставка | | |
| | 90% | 10% | 17,5% | 18,5% | 19,5% |
| | 50% | 50% | 18,0% | 19,0% | 20,0% |
| | 10% | 90% | 18,5% | 19,5% | 20,5% |

| «Срочный безотзывный банковский вклад (депозит) «Личный выбор», заключенный до 01.08.2016 | Срок вклада (депозита) | | |
|---|---|---|---|
| | 1 год | 2 года | 3 года |
| | 19,5% | 20,5% | 21,5% |

146

www.belinvestbank.by

Открытое акционерное общество «Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк», 220002, г. Минск, пр. Машерова, 29. УНП 807000028.
Лицензия на осуществление банковской деятельности Национального банка Республики Беларусь №3 от 03.06.2013 г.

Паритетбанк

www.paritetbank.by

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2016 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2016 | 01.07.2015 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 97 963 | 91 900 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 458 | 355 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 253 609 | 481 445 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 216 628 | 250 349 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 839 475 | 629 863 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 1 482 517 | 795 900 |
| | Инвестиции в зависимые юридические лица | | - | - |
| | Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица | | - | - |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 1 459 | 1 459 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 333 120 | 143 856 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | 7 626 | 12 986 |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | - | - |
| 13 | Прочие активы | 1112 | 50 681 | 26 929 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | 3 283 536 | 2 435 042 |
| 15 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | - | 84 175 |
| 17 | Средства банков | 1202 | 532 764 | 347 144 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | 1 781 201 | 1 263 664 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | 20 632 | 90 063 |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | 4 511 | 110 529 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | 2 339 108 | 1 895 575 |
| 24 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | 660 556 | 327 936 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | 31 592 | 27 199 |
| | Всего капитал, принадлежащий головной организации-банку | | - | - |
| | Доля неконтролирующих акционеров | | - | - |
| 28 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | 114 235 | 107 574 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | 138 045 | 76 758 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | 944 428 | 539 467 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | 3 283 536 | 2 435 042 |

## КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 июля 2016 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2016 | 01.07.2015 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 183 150 | 184 494 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 86 089 | 101 178 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 97 061 | 83 316 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 18 866 | 15 599 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 4 562 | 3 201 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 14 304 | 12 398 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | 71 | 11 |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 938 | 5 333 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 36 119 | 14 568 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | - | 2 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | 25 020 | 53 906 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 5 438 | 14 037 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 79 551 | 63 847 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 3 694 | 3 816 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 45 666 | 8 096 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | - | - |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 45 666 | 8 096 |
| | Доля в прибыли(убытке) зависимых юридических лиц | | - | - |
| | ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | | 45 666 | 8 096 |

И.о. Председателя Правления С.Г.Кожекина

Главный бухгалтер И.Б.Сафронова

Дата подписания «12» июля 2016 г.

Ссылка на сайт, где опубликована отчетность:
**http://www.paritetbank.by/about/finance/kvartal/2016/**

Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности от 27 октября 2014 года № 5

# ГАЙНЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

## проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № лота | Адрес земельного участка | Площадь земельного участка | Наименование инженерных сетей | Начальная цена (бел. рублей) | Задаток (бел. рублей) | Расходы по изготовлению документации |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | д. Медухово, ул. Рябиновая, 20, У-8, кадастровый номер 623280807401000106 | 0,1447 | Подъездные пути удовлетворительные | 3363 руб. | 673 руб. | 1409 рублей 01 копейка |
| 2 | д. Медухово, ул. Солнечная, 22, У-10, кадастровый номер 623280807401000103 | 0,1432 | Подъездные пути удовлетворительные | 3363 руб. | 673 руб. | 1389 рублей 11 копеек |
| 3 | д. Родевичи, ул. Школьная, У-21Б, кадастровый номер 623280810601000072 | 0, 1798 | Подъездные пути удовлетворительные | 2653 руб. 85 коп. | 530 руб. 77 коп. | 1435 рублей 73 копейки |

**Аукцион проводится 23.09.2016 г. в 10.00 по адресу: д. Логоза, ул. Центральная, д. 2 Логойского района Минской области, здание Гайненского исполнительного комитета.**

Документы принимаются ежедневно с 8.00 до 17.00, кроме субботы и воскресенья, **до 20 сентября 2016 года** (последний день подачи документов – **19 сентября 2016 г. до 17.00**) по адресу: д. Логоза, ул. Центральная, д. 2 Логойского района Минской области.

*Задаток перечисляется на р/с № 3600619021108 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ОКПО 04431493, УНН 600181697, Гайненский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901.*

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации.

Контактные телефоны: 801774 56 4 36, 56 4 98.

# ОАО «Таксомоторный парк» г. Брест

**извещает своих акционеров (их представителей) о проведении 30 августа 2016 г. внеочередного общего собрания по адресу: г. Брест, ул. Д. Донцова, 6/1, каб. 33.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. О присоединении ОАО «Таксомоторный парк» г. Брест к ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ» и утверждении договора о присоединении.
2. О назначении даты проведения общего собрания акционеров Общества по утверждению передаточного акта.

Местонахождение ОАО «Таксомоторный парк» г. Брест: г. Брест, ул. Д. Донского, 6/1, каб. 33.

Место проведения собрания: г. Брест, ул. Д. Донского, 6/1, каб. 33.

Начало работы собрания в 11.15.

Регистрация участников собрания с 10.45 до 11.10 в день проведения собрания. При себе иметь документ, удостоверяющий личность.

Список акционеров для регистрации участников собрания составлен по данным реестра акционеров на 17 августа 2016 г.

С материалами по вопросам повестки дня собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник–пятница) с 14.00 до 17.00, начиная с 19.08.2016, по месту нахождения Общества.

Орган, созывающий общее собрание: наблюдательный, основание созыва: протокол от 17.08.2016 № 17-08/2016.

***Наблюдательный совет ОАО «Таксомоторный парк» г. Брест***

УНП 200017199

■ Дзеці адной зямлі

# ЯДНАННЕ ПРАЗ ТРАДЫЦЫІ

## Як жывуць нашчадкі беларускіх перасяленцаў у Сібіры?

**Ужо больш як два дзесяцігоддзі ў Іркуцку існуе маладзёжны клуб «Крывічы». Яго ўдзельнікі — сібіракі ў некалькіх пакаленнях, але іх продкі — дзяды, прадзеды — з Беларусі. Днямі ў Мінску, у Літаратурным музеі Петруся Броўкі, прайшла сустрэча з заснавальнікам «Крывічоў» Алегам РУДАКОВЫМ і актыўнай удзельніцай клуба, спявачкай і майстрыхай Вольгай ГАЛАНАВАЙ.**



Клуб «Крывічы» наладзіў работу ў многіх кірунках: гэта студыя аўтэнтычных спеваў, навучанне бытавым і сярэднявечным танцам, рамесная майстэрня, дзе займаюцца вырабамі з саломкі, шыюць, ткуць ручнікі, робяць старажытныя фібулы. Удзельнікі клуба арганізоўваюць этнаграфічныя вандроўкі па вёсках перасяленцаў з Беларусі, вывучаюць беларускую мову і праводзяць беларускія традыцыйныя святы. Таксама «Крывічы» ладзяць штогадовы міжнародны фестываль «Беларускі кірмаш», куды часта запрашаюць музыкаў і гурты з Беларусі.

— Аснова нашай дзейнасці — правядзенне старажытных беларускіх свят, — расказвае Алег Рудакоў. — Усё пачалося ўвосень 1995 года. Тады ў мясцовай газеце «Советская молодёжь» я надрукаваў аб'яву з прапановай да сяброў-беларусаў аб'яднацца. Але калі мы першы раз сустрэліся, то не маглі вырашыць, чым будзем займацца ўсё разам. Нехта прапаноўваў хадзіць на паляванне, нехта — вудзіць рыбу. Дарэчы, аказалася, што беларускую мову, акрамя мяне, амаль ніхто з іркуцкіх беларусаў не памятаў, але менавіта святы сталі момантам, які аб'яднаў літаральна ўсіх. Многія памятаюць Купалле, Каляды, Гуканне вясны і розныя абрады, што іх суправаджаюць.

**Прыязджаючы ў вёску, адразу бачыш, што яе заснавалі беларусы. Тут абавязкова ёсць прамая галоўная вуліца, перад хатамі — акуратныя клумбы з кветкамі, кустамі.**

Цяпер для суполкі «Крывічы» беларускія святы сталі пэўнага кшталту брэндам, у іх удзельнічаюць не толькі беларусы, але і прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў, што жывуць у Іркуцку. Сюжэты пра адметныя святкаванні часта з'яўляюцца на тэлеканалах, а неяк беларуская калядная Каза нават віншавала з тэлеэкранаў усіх жыхароў Іркуччыны з Новым годам.

Адным з асноўных кірункаў работы «Крывічоў» з'яўляюцца этнаграфічныя экспедыцыі па сібірскіх беларускіх вёсках.

— Мы пабачылі, што нацыянальныя традыцыі шмат дзе захаваліся, шмат дзе пра іх памятаюць, — кажа спадар Алег. — Таму і вырашылі больш увагі ўдзяліць вандроўкам, запісваем песні, танцы, гісторыі пра тое, як вёскі ўтвараліся, якія людзі перасяляліся. У хуткім часе будзем актыўна працаваць над выданнем матэрыялаў з экспедыцый.

Алег Рудакоў кажа: прыязджаючы ў вёску, адразу бачыш, што яе заснавалі беларусы. Тут абавязкова ёсць прамая галоўная вуліца, ад яе адыходзіць некалькі перпендыкулярных адгалінаванняў. Часта форма вёскі нагадвае фігуры беларускага арнаменту. Перад хатамі — акуратныя клумбы з кветкамі, кустамі. Таксама пра беларускасць вёскі сведчаць бялявыя валасы дзетак. Кажуць, што з цягам часу яны цямнеюць, але нараджаюцца немаўляты пераважна светлавалосымі. Таксама часта вуліцы ці асобныя раёны вёсак маюць беларускія назвы: Гомель, Краіна, Забока, Баравуха.

Цікава, што бураты, якія спрадвеку жывуць у Сібіры, нават узімку выпускаюць кароў у поле. Яны амаль не нарыхтоўваюць сена. Але ж беларусы не перанялі такой звычкі. І сёння яны зімою трымаюць кароў у хлявах, а ўлетку сушаць для іх шмат сена.

Падзяліўся спадар Алег і некалькімі цікавымі назіраннямі з экспедыцый у асобныя беларускія паселішчы.

**«Калі мы першы раз сустрэліся, то не маглі вырашыць, чым будзем займацца ўсе разам. Нехта прапаноўваў хадзіць на паляванне, нехта — вудзіць рыбу».**

Вёска Чарчэт Тайшэцкага раёна была заснавана беларускімі перасяленцамі ў 1903 годзе, тут і сёння захавалася шмат старых традыцый. Адна з тутэйшых адметнасцяў — на сценах дамоў, на платах, брамах толькі тут можна пабачыць традыцыйныя васьміканцовыя зоркі. Як патлумачылі мясцовыя людзі — гэта абярэгі, што бароняць хату ад маланак і пажараў. Ёсць у вёсцы музей, дзе збіраюць старажытныя рэчы, і клуб «Крыніцы», дзе займаюцца этнаграфічнымі даследаваннямі, запісваюць і спяваюць старажытныя песні, ладзяць святы. Таксама тут ужо некалькі гадоў працуе свая батлейка, лялькі і спектаклі для якой рыхтуюць разам з дзецьмі.

У вёсцы Жызнёўка Заларынскага раёна сёння жыве шмат прадстаўнікоў роду Петрусёвых. Сюды ў 1912 годзе з Беларусі прыехалі тры браты Ціхан, Архіп і Карп Петрусі, яны былі аднымі з заснавальнікаў вёскі. Сёння ў родзе Петрусёвых (з цягам часу прозвішча змянілася) — каля 240 чалавек. Мясцовыя распавядаюць, што адзін з братоў-заснавальнікаў — Ціхан — быў чарадзеем. Яшчэ ў Беларусі стары млынар навучыў яго чараваць. Калі прыехаў у Сібір, яго ўсе баяліся, казалі, што Ціхан быў страшным чалавекам, умеў змей загаворваць, кіраваць стыхіяй. А неяк у вёсцы было вяселле, куды яго не запрасілі, дык мужчына прыгразіў, што коні спыняцца і не паедуць на вяселле. Так і сталася.

А ў Андрушыне Куйтунскага раёна раней у адным канцы жылі перасяленцы з Гродзеншчыны, а ў другім — з Віцебшчыны. На рэчцы, што дзяліла вёску на дзве часткі, збіраліся на мосце і біліся каламі. Адна бабуля расказвала, што раней нават замуж дзеўкі не выходзілі за прадстаўнікоў іншага канца вёскі...

Што да песень і танцаў, якія яшчэ помняць старажылы сібірскіх беларускіх вёсак, часам іх версіі аказваюцца больш старажытнымі, чым тыя, што бытуюць у Беларусі. Думаецца, работа па іх вывучэнні, запісе і захаванні можа быць карыснай не толькі для сібіракоў-беларусаў, але і для ўсіх прадстаўнікоў нашага народа. Гэта магчымасць яшчэ больш даведацца пра адметнасці нашай культуры, беларускага светаўспрымання. Таму чакаем новых сустрэч з «Крывічамі», выдання матэрыялаў з экспедыцый клуба і жадаем плёну ў новых вандроўках.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
*vesialuha@zviazda.by*

***Вольга Галанава расказала, што, паводле апошняга афіцыйнага перапісу, на тэрыторыі Іркуцкай вобласці жыве каля 50 тысяч беларусаў. Аднак лічба меншая, чым ёсць насамрэч: і гэта пацвярджаюць перапісы, што праводзіліся раней. Часта таксама здараецца, што мясцовыя ўлады ніякіх перапісаў у аддаленых вёсках не праводзяць, а проста запісваюць беларусаў рускімі. Сама ж Вольга, у якой ужо трэцяе пакаленне сям'і жыве ў Сібіры, дакладна не ведае, адкуль з Беларусі паходзяць яе продкі. Кажа, што дзядулі з бабулямі ніколі пра гэта не расказвалі. Ведае толькі, што яе прадзед у 1930-я гады быў рэпрэсіраваны і 10 гадоў правёў за кратамі.***

■ Родныя тапонімы

# «ЦАРЫЦЫН ДАР» І «ЦАРЫНДАРШЧЫНА»

**Ужо зусім хутка, 4 верасня, у Рагачове пройдзе Дзень беларускага пісьменства. Горад і ўся гомельская вобласць актыўна рыхтуюцца да гэтага важнага нацыянальнага свята. Не застаюцца ўбаку і чытачы «Звязды». Наша пастаянная падпісчыца Соф'я КУСЯНКОВА з вёскі Лучын Рагачоўскага раёна, даслала ў рэдакцыю шэраг тлумачэнняў тапонімаў гэтага рэгіёна. Пастаянны эксперт «Звязды», старшыня Рэспубліканскай тапанімічнай камісіі пры НАН Беларусі Ігар КАПЫЛОЎ даследаванні, якімі займаецца Соф'я Парфір'еўна, у цэлым ухваляе. Таму мы прапануем і вашай увазе тлумачэнні рагачоўскіх тапонімаў ад мясцовай краязнаўцы.**

Рагачоўшчына з'яўляецца тым месцам, дзе ад старажытных часоў сыходзіліся межы і інтарэсы спачатку розных плямёнаў, потым княстваў — Полацкага, Тураўскага, Смаленскага, Чарнігаўскага, Кіеўскага. Таму і тапаніміка тут вельмі разнастайная. Мяняліся парадкі, лад жыцця, каштоўнасці. Нязменнымі заставаліся толькі тапонімы. Яны захоўвалі ў сабе вялікую колькасць інфармацыі і ўсе неабходныя тлумачэнні.

## Балты і іх гідронімы

Рэкі ў старажытнасці, ва ўмовах суцэльных лясоў і непраходных балот, служылі адзінымі камунікацыйнымі артэрыямі і прыроднымі межамі. Таму нашы далёкія продкі і сяліліся па іх берагах і вельмі часта давалі назвы месцам пасялення па звязаных з імі водных аб'ектах і іх частках.

Найбольш буйная рака, якая працякае на Рагачоўшчыне, — Днепр (Барысфен, Данапрас). «Барысфен» — ад грэчаскага «непр», «не пря» — мірная рака. «Данапрас» паходзіць ад агульнаіндаеўрапейскага «ден», «дану» — цячэнне. Згодна з «Велесавай кнігай» у ІІІ-ІV стагоддзях Днепр меў нават мусульманскую назву «Эрак».

Рака Друць (у Рагачове ўпадае ў Днепр) — даславянскі балцкі гідронім. Ад балцкага «друтас» — магутны, паўнаводны.

Калі пагледзець на распаўсюджванне на Рагачоўшчыне тапонімаў і гідронімаў балцкага паходжання, то зразумела, што балты рассяляліся ў паўночна-заходнім кірунку, па Друці. У VIII-Х стагоддзях тэрыторыя Падняпроўя была заселена славянскімі плямёнамі радзімічаў і дрыгавічоў. Пэўныя паселішчы — Лучын, Войшчын — лічацца калоніямі смаленскіх крывічоў.

З часам балты былі асіміляваны славянскімі плямёнамі. Але дадзеныя імі назвы засталіся. Рака Друць і другі прыток Дняпра Ракатун (ад балцкага «ракціс» — крыніца). З балцкімі каранямі можна звязаць і назву вёскі Рэкта — тое ж, паселішча на крыніцы.

Вёска Мыза (страчана) — можна меркаваць, паселішча заснавана балтамі ці іх нашчадкамі, якія помнілі сваю мову. «Мыза» — па-нашаму хутар.

## Усходнія матывы

Вёска Турск — пасяленне, заснаванае стараабрадцамі, якія падчас рэформы Нікана сыходзілі з Маскоўскага царства праз свае перакананні ў веры. І цяпер у ёй жывуць продкі сем'яў-заснавальнікаў — Сакаловы, Шчарбаковы, Лучанінавы, Шышовы. Назва паселішча паходзіць ад старажытнаславянскага імя Тур — аднаго з асабліва папулярных і любімых уласных імёнаў. А сама форма назвы паселішча ўказвае на множнасць. Магчыма, у кожнай з сем'яў-заснавальнікаў быў мужчына з імем Тур. Турск — пасяленне Тураў. У адрозненне ад «Тураў» — пасялення, заснаванага Турам.

Праз свае тапонімы помніць Рагачоўшчына часы прысутнасці Налівайкі (1595 г.), Залатарэнкі (1654 г.). З гэтым можна звязаць узнікненне назваў «Гайдукоўка», «Казацкі» — нават калі гэтыя паселішчы атрымалі назвы ад імя-мянушкі спадчыннікаў тых гайдукоў і казакаў.

Вынік уплыву Расіі і прысутнасці расійскіх войскаў — вёскі Княжына, Гусараўка, Драгунск, Казённая Слабада. У «Слабодах» маглі пражываць «вольнікі», але калі Слабада належала дзяржаве — яе называлі «Казённай».

## «Гады», якія «дагадзілі»?..

Жыхары заўсёды тлумачаць назвы населеных пунктаў у станоўчым для сябе сэнсе. Напрыклад, ёсць два народныя варыянты паходжання назвы вёскі Гадзілавічы. Абодва звязаны з наведваннем Рагачоўскага павета імператрыцай Кацярынай II у 1780 годзе. Гэта гістарычны факт, бо паводле І падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 годзе да Расіі адышлі паўднёва-ўсходнія беларускія землі, у тым ліку частка сучаснага Рагачоўскага раёна.

Вядома ж, імператрыца дэманстравала свой клопат пра новыя землі і падданых на іх. Яна аб'ехала і ўвесь Рагачоўскі павет, сустрэлася са сваімі новымі падданымі. І, як рабілася ў такіх выпадках, каб выклікаць да сябе сімпатыю, «жалавала» ды «мілавала».

І быццам бы ў цяперашніх Гадзілавічах падчас яе візіту ў імператрыцы нешта скралі. Караць «гневам сваім» яна не стала, каб не псаваць, гаворачы сучаснай моваю, свой імідж. Але сказала — «гэткія гады, гадаўцы». Адсюль быццам і прыляпілася назва «Гадзілавічы». Бо нагадзілі ўладам.

Самі ж гадзілаўцы лічаць наадварот — што яны «дагадзілі» імператрыцы, і таму — Гадзілавічы.

## Дар, што не прапаў

Пасёлак Царыцын Дар існаваў да 1925 года ў Лучынскім сельсавеце. І час узнікнення, і назва звязаны таксама з наведваннем Рагачоўскага павета Кацярынай ІІ у 1778 годзе. За добры прыём мілавала імператрыца сяло Лучын зямлёю. І зямлю тую назвалі «Царындаршчына», а пасёлак, які ўзнік на ёй, — «Царыцын Дар».

Яшчэ ў 60-я гады мінулага стагоддзя назва гэтая была ва ўжытку. Потым згодна з новым планам калгасных угоддзяў гэты «дар» стаў проста «Поле № 1». І ўжо мала хто ведае, што існавала і селішча, і поле з такімі прыгожымі, красамоўнымі і дакладнымі назвамі.

Быў дакладны гістарычны факт — і яго не стала. Але ж дзякуючы гэтаму факту, гэтаму Дару, зямля ва ўтвораным у свой час калгасе засталася.

## Упісаныя ў раку

Згадка пра Лучын у летапісах упершыню датуецца 1136 годам. А гэта азначае, што пасяленне ўзнікла значна раней і ўжо мела пэўнае значэнне і статус.

Назва азначае «пасяленне ў вылучыне, выгіне ракі», менавіта так вёска і размешчана.

Адметным падаецца і само словаўтварэнне — не Лучыно, не Лучыск, не Лучынне, а Лучын. Ёсць многа аднакарэнных, матываваных словам «лука» назваў, але форма Лучын — адзіная ў Беларусі і Расіі. Ёсць Лучын толькі на Жытоміршчыне ва Украіне. Чаму і як дзве аднолькавыя назвы з'явіліся ў розных краях — пытанне, на якое цяпер цяжка адказаць.

Рагачоў таксама вельмі старажытны, у летапісах узгадваецца ў 1140-х гадах. Ёсць меркаванне, што назва Рагачоў паходзіць ад «рог» — у сэнсе круты паварот. Тут рака Друць робіць круты паварот і ўтварае быццам вугал.

З такім тлумачэннем не пагаджаецца прафесар Лемцюгова. Яна адзначае, што назва заканчваецца на «-оў», што ўказвае на прыналежнасць. Прыгадваецца старажытнае імя-мянушка Рагач (Рогач) — упарты, задзірысты чалавек. Ёсць слова «рагаціцца» — упарціцца. Таму найменне можа азначаць індывідуальную прыналежнасць чалавеку з такімі вартасцямі.

Згодна з іншай версіяй, назва паходзіць ад старажытналітоўскага «рогас» — алтар, свяцілішча, святое месца. Таксама ёсць паданне, што Рагачоў доўга супраціўляўся прыняццю хрысціянства — «рагаціўся».



■ Нефармат

# АЖЫНАВАЕ ВАРЭННЕ

Дачка назбірала ажын недалёка ад нашага лецішча. Дома мы рашылі зварыць варэнне. Яшчэ перад выхаднымі калега хваліўся, што яны з жонкай наварылі смакаты, калі змяшалі ажыны з грушамі. Мы задумалі паэксперыментаваць, і наступнай раніцай пайшлі з мужам на рынак купіць груш. Выбар быў неблагі. Разгаварыліся з дзядзькам, які прывёз з Кобрынскага раёна некалькі скрыняў фруктаў. Грушы яго вельмі вялікія, сакавітыя, але на выгляд — крышачку недаспелыя. Паводле слоў прадаўца, могуць яшчэ паляжаць. «Нам на варэнне», — патлумачыла я. — «О, калі б вы прыйшлі ўчора пад канец дня, то я пераспелыя і крыху пабітыя фрукты гаспадынькам на варэнне так аддаваў», — сказаў кобрынскі фермер. У такога добразычліўца захацелася абавязкова купіць. Прадавец узважыў па нашай просьбе чатыры кіло груш, і мы пайшлі варыць варэнне.

Галоўны кансультант у справе любых нарыхтовак, мая сястра сказала, што лепей грушы папярэдне здрабніць на мясарубцы, тады ў варэння будзе больш вытанчаны смак. Мы з дачкой захапіліся працэсам, але разышліся ў меркаваннях наконт колькасці цукру. Я рашыла патэлефанаваць яшчэ адной прызнанай у нашым асяродку гаспадыні — былой аднакурсніцы. Пагаварылі, вядома, не толькі пра варэнне, успомнілі сямейныя падзеі, падзяліліся навінамі. І неяк раптоўна зразумелі, што ні я ў яе, ні яна ў мяне ў гасцях не былі добрую пяцігодку.

— Трэба неадкладна выпраўляць становішча, — сказалі мы ледзь не ў адзін голас. І я запрасіла Ірыну да сябе. Яна, хоць мае звычку планаваць выхадныя загадзя па прычыне вялікай колькасці спраў, нечакана лёгка згадзілася. І праз нейкую гадзіну пад'ехала. Да гэтай пары мы сабралі на стол што-нішто да чаю. Ірына, як аказалася, нядаўна прыехала ад сваякоў з Расіі, нават флэшку з сабой захапіла, каб паказаць некатэрыя фотаздымкі. Расказ яе быў трохі сумбурным, але ад гэтага не менш цікавым. У першай частцы свайго аповеду прыяцелька катэгарычна заявіла, што ў суседняй краіне большыя маштабы, больш размах нават у мысленні людзей і адпаведна — большыя магчымасці для самарэалізацыі, стварэння ўласнага дабрабыту, перспектыў і гэтак далей. Прыкладам могуць паслужыць гісторыі яе некаторых сваякоў. А ў канцы яна згадала пра тых суайчыннікаў, хто вечна ўсім незадаволены. На яе думку, іх варта было б пасадзіць у аўтобус і правезці кіламетраў шэсцьсот па расійскіх дарогах, пасля чаго крытычнага імпэту ў песімістаў паменшае.

Варта зазначыць яшчэ адну асаблівасць характару Ірыны: яна мае бясконцае мноства знаёмых. Як сама кажа, некаторыя з іх — «дзіўныя» знаёмыя, іншыя ўзнікаюць аднекуль невядома як, але факт застаецца фактам: да яе людзі цягнуцца. Таму, калі зайшла гаворка пра магчымы пошук кватэры ў Мінску для маёй дачкі, якая паступіла летам у сталічную ВНУ, даўняя прыяцелька сказала, што мае на прыкмеце адну энергічную пенсіянерку, якая раней брала на кватэру студэнтаў. І мы, вядома, запісалі, адрас.

Наша размова зацягнулася да вечара. Муж тым часам выйшаў у суседні дом да калегі-навукоўца за новай брашурай апошняга і, як часта бывае, забыўся мабільны дома. Мы з Ірынай яшчэ раз пакаштавалі варэння і перад тым, як апошні раз давесці да кіпення, вырашылі дабавіць трохі цукру. Спатрэбілася тэрмінова яго купіць. Каб папрасіць аб гэтым мужа, я набрала хатні нумар яго калегі. Да тэлефона падышла жонка, мы пагаварылі пра справы. Валянціна сказала, што на наступныя выхадныя яны збіраюцца ў Гродна — проста пагуляць па горадзе, і запрасіла нас далучыцца, каб весялей было.

І вось у мінулую суботу мы з такім задавальненнем гулялі па вуліцах самага прыгожага горада Беларусі! Пакланіліся мурам старажытнай Каложы, пахадзілі па слаўтых мясцінах Замкавай гары, наведалі Музей гісторыі рэлігій, заехалі на кароткі час у турыстычны комплекс «Каробчыцы». А да гэтага я столькі часу збіралася ў Гродна, намячала паездкі, потым адкладвала іх і стагнала, што Гродна сам да мяне ў Брэст не прыйдзе, а таксама цытавала калегу, якая даўным-даўно пісала ў нашай газеце: «Гародня — гэта ж не Парыж, бярыце білет і едзьце!» Паездка выдалася нечаканай і ад гэтага яшчэ больш прыемнай.

А пачыналася ўсё, калі памятаеце, з ажынавага варэння. Я ўсё гэта да таго, дарагі чытач, што трэба больш сустракацца з сябрамі, знаёмымі, сваякамі, а не замыкацца ў сценах кватэры і лецішча, узвальваць на сябе цяжар праблем і насіцца з імі як дурань з маляванай торбай. Прыемныя нечаканасці бываюць побач, трэба толькі ўважліва глядзець навокал.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.53 | 20.32 | 14.39 |
| Віцебск — | 5.39 | 20.25 | 14.46 |
| Магілёў — | 5.44 | 20.22 | 14.38 |
| Гомель — | 5.45 | 20.14 | 14.29 |
| Гродна — | 6.09 | 20.46 | 14.37 |
| Брэст — | 6.14 | 20.42 | 14.28 |

### Месяц

*Поўня 12.26.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

### Імяніны

*Пр. Дар'і, Еўдакіі, Марыі, Ноны, Сямёна.*
*К. Алены, Браніславы, Ілоны, Браніслава.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**18 ЖНІЎНЯ**

**1782** год — у Санкт-Пецярбургу ўрачыста адкрыты помнік Пятру І («Медны коннік»). Ён размешчаны ў цэнтры Сенацкай плошчы. Аўтарам гэтай грандыёзнай скульптуры стаў французскі скульптар Эцьен Марыс Фальканэ.

**1931** год — нарадзіўся Скеп'ян Мікалай Антонавіч, беларускі вучоны ў галіне алергалогіі і прафесійнай паталогіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па пытаннях алергалогіі і медыцынскай справы. Браў удзел у распрацоўцы і ўкараненні тэхналогіі лячэбна-аздараўленчага спелеакомплексу на базе рудніка ВА «Беларуськалій» у Салігорску. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2003).

**1946** год — 70 гадоў таму нарадзіўся (вёска Казловічы Слуцкага раёна) Аляксандр Андрэевіч Марціновіч, беларускі літаратуразнаўца, публіцыст, крытык. Даследуе класіку беларускай літаратуры. Выдаў зборнікі літаратурна-крытычных артыкулаў «Далучэнне», «Пад небам вечнасці», «Дарога ў запаветнае». Аўтар краязнаўчай кнігі «Ля Каменкі бруістай», гістарычных зборнікаў і эсэ. Укладальнік кніг публіцыстыкі, паэзіі і іншых.

**1966** год — нарадзілася (г. Барысаў) Алена Брава, беларуская пісьменніца. Першы празаічны твор (аповесць «Бязлітасны мой воін») быў надрукаваны ў 2001 годзе ў часопісе «Крыніца». Ураджанні ад жыцця на сацыялістычнай Кубе ляглі ў аснову аповесці «Каменданцкі час для ластавак», якая прынесла пісьменніцы вядомасць і ўвайшла ў аднайменны зборнік прозы («Мастацкая літаратура», серыя «Дэбют», 2004). Аўтар апавяданняў «Тапіць дзяўчатак тут забаронена», «Змяя, пакрытая пёрамі птушкі Сонца» і інш.

**1991** год — у 8 гадзін раніцы міністр абароны СССР Дзмітрый Язаў паведамляе сваім намеснікам Грачову і Калініну аб маючым адбыцца ўвядзенні ў краіне надзвычайнага становішча. Днём намеснік старшыні Савета абароны пры прэзідэнце Бакланаў, сакратар ЦК КПСС Шэнін, кіраўнік апарата прэзідэнта Болдзін і генерал Варэннікаў адпраўляюцца на персанальным самалёце Язава ў Фарас для перамоў з Міхаілам Гарбачовым, каб заручыцца яго згодай на ўвядзенне надзвычайнага становішча. Як вядома, яны ні пра што не дамовіліся і на прэзідэнцкай дачы ў 16.30 былі адключаныя ўсе віды сувязі, у тым ліку і канал, які забяспечваў кіраванне стратэгічнымі ядзернымі сіламі СССР.



Было сказана

**Нэлі ТУЛУПАВА, паэтэса:**

*«Каб не трымацца рэкам берагоў,*
*Дык не зазнаць бы ім ніколі мора!»*

■ Запрашальнік

# МАГДАЛЕНАЎСКІ БАЛЬ ВА УЗДЗЕ

**На пляцоўцы каля Палаца культуры ва Уздзе 20 жніўня адбудзецца бальрэканструкцыя канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Мерапрыемства ладзіцца ў гонар адной са знакамітых асоб Уздзеншчыны — мецэнаткі, асветніцы, княгіні Марыі Магдалены Радзівіл. Спаўнілася 155 гадоў з дня яе нараджэння.**



У гасцей і жыхароў горада будзе магчымасць апынуцца на балі ў Магдалены, даведацца пра яе лёс, патанчыць вальс і кадрыль на майстар-класе, наведаць мастацкі салон, выставы і нават сфатаграфавацца з «родзічамі», «сябрамі» і «пісьменнікамі», якім Магдалена фінансавала выданне зборнікаў. Іх і саму мецэнатку будуць увасабляць члены Літаратурна-творчага аб'яднання маладых пісьменнікаў Уздзеншчыны «Вясёлка», а таксама актывісты раённай арганізацыі БРСМ. Цэнтральная раённая бібліятэка імя П. Труса правядзе ўжо традыцыйную «Літаратурную ПРЫШЧЭПКУ».

Напрыканцы балю ўсім ахвотным прапануецца экскурсія па маёнтку мецэнаткі ў Першамайску (Уздзенскі раён), які застаўся амаль такім, якім быў пры жыцці Магдалены.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

## УСМІХНЕМСЯ

Дружба — гэта калі ты яшчэ не паспеў расказаць пра праблему, а ў цябе ўжо наліта.

**Лепшая дыета — афтальмалагічная.**
**Есці можна ўсё і ў любых колькасцях, але толькі вачыма.**

Толькі таты ўмеюць надзець дочкам панчохі так, каб дзве рысачкі былі спераду і пры гэтым пяткі абсалютна на сваім месцы.

**Мужчынская логіка.**
**«Вам холадна? Прыцісніцеся да мяне. Вам горача? Распраніцеся».**

У жыцці кожнага бацькі адночы надыходзіць шчаслівы момант, калі тэлефануе дзіця і пытаецца:
— Тата, табе колькі піва браць?




Малюнак Алега ГУЦОЛЫ.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 3261.
Нумар падпісаны ў 19.30 17 жніўня 2016 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12